Ніва

Тыднёвік Беларускага грамадска-культурнага таварыства

№ 17 (1052) ГОД XXI 25 КРАСАВІКА 1976 г. ЦАНА 60 гр.



ПАД РОДНЫМ НЕБАМ

*Нашто захапляцца
крышталъным палацам,
што вабіць за дальняй гарой?
Як роднаму сыну
мне сніцца хаціна
з буслянкай на ліпе старой.*

*Яшчэ мне — дзіцяці —
расказвала маці
забытую ўжо даўніну,
як прадзед далёкі
на ліпу высока
старую ўзвалок барану.*

*Каб ранняй парою,
здалёку вясною
буслы прыляталі сюды.
Гняздо даглядалі,
дзяцей гадавалі,
не ведалі гора, бяды.*

*У іх было свята,
калі бусляняты
няўрымсцяцца ў родным
гняздзе.
I з самага ранку
руплівая мамка
вучыцца лятаць павядзе.*

*I ўжо на балоце,
паважна ў ляноце
да вечара можна гуляць.
Там харч здабывалі,
крыло спрабавалі,
каб потым высока лятаць.*

*Але за буслiхай
падкраўся паціху
у зарасляx здрадніцкі крок,
над ціхім балотам,
высокім чаротам
стрэл грымнуў смяротны
здалёк.
Упала бусліха.
Вакол стала ціха, —
пярэпалах быў не малы.
Над ціхай пратокай,
высока, высока
трывожна кружылі буслы.*

*Жыццё не здаецца.
З параненым сэрцам,
за крыкам сівых жураўлёў, —
у вырай-дарогу,
забыўшы трывогі,
паплыў клін і нашых буслоў.*

*Туды, дзе заўсёды
няма непагоды,
дзе цёпла бывае зімой.
Дзе вецер і сцюжа
ніколі не кружаць
і сонца блішчыць над зямлёй.*

*Але і за морам
ім сняцца прасторы
радзімы і крэўных сяброў.
I раніцай бусел
з дарогі вярнуўся
ў старую буслянку — дамоў.*

*Адолеў трывогі
бясконцай дарогі,
так сэрцу быў любы свой край...
Дадому вярнуўся
пакрыўджаны бусел,
хоць ведаў — буслянку шукай.*

Мікола Хведаровіч

ПРАЗ ТЫДЗЕНЬ У "Ніве"



Гэтыя крашанкі зрабілі члены гуртка Украінскага грамадска-культурнага таварыства ў Гажове Вялікапольскім. А прыслаў іх нам Міхась Пэцух. Сардэчна дзякуем! А ўсім нашым чытачам шлем найлепшыя велікодныя пажаданні!

М іхалова — гэта пасёлак з традыцыямі суконнай прамысловасці. Ёсць тут ліцэй, прафесіянальная сельскагаспадарчая школа, тэкстыльная фабрыка імя дыр. Сяржана, швейнае прадпрыемства, ГС, СКР.

ЗНОЎ АЖЫЎЛЕННЕ Ў ГОК

Кожны, хто будзе ў цэнтры гэтага мястэчка, убачыць жалезныя фігуры: сейбіта, або штось, што нагадвае касмічную ракету і г.д. Гэта памяткі па Рышардзе Варабею, былым кіраўніку гміннага цэнтра культуры (ГОК). Калі ён выехаў, стала ціха ў гэтым двухпавярховым мураваным будынку.

Але па чарзе.

Спачатку міхалоўскі дом культуры доўга быў у рамонце. Пяць гадоў. Адкрылі яго ў канцы мая 1971 года. Памясцілася ў ім: клубкавярня, святліца, бібліятэка, чытальня, кіно „Чайка" на 170 асоб. Малады кіраўнік дома культуры супольна з інструктарамі арганізавалі музычны, тэатральны і дзіцячы танцавальны калектывы, фатаграфічны гурток і гурток жывапісцаў.

Асаблівай актыўнасцю выдзяляліся члены музычнага калектыву. Яны нават складалі ўласныя музычныя творы, выкарыстоўваючы багаты мясцовы фальклор. Так стваралі гумарыстычныя маналогі, скетчы, а нават прыпеўкі, якія адлюстроўвалі звычаі тутэйшых жыхароў, іх штодзённыя гаспадарчыя клопаты. З імі выступалі на ўласнай сцэне і на фэстынах.

Тэатральны калектыў ставіў дзве-тры п'есы ў год. Між іншым, „Вываражыла" Ю. Геніуша і „Трыбунал" А. Макаёнка, якія карысталіся

(Працяг на стар. 4)

VIII З'ЕЗД БГКТ

БАНК ДУМАК

БЕЛАРУСЫ НА ЗАХОДНІМ ПАМОР'І

Вельмі часта на чыгуначных і аўтобусных вакзалах Шчэцінскага ваяводства можна пачуць беларускую гутарку. Часцей за ўсё з вуснаў сялян, прыязджаючых у горад па справункі, або „сяляна-рабочых", вяртаючыхся з гарадскіх прадпрыемстваў дамоў у вёску, дзе пасля васьмігадзіннага рабочага дня на фабрыцы чакае яшчэ непачаты край працы на гаспадарцы.

Размаўляюць рознымі дыялектамі: пінскімі, ваўкавыскімі, беластоцкімі.

Сусветныя катастрофы, „вандраванне народаў" параскідалі беларусаў па ўсім свеце. I нічога дзіўнага, што на Заходнім Памор'і Польшчы можна сустрэць іх таксама. Не заўсёды здаюць яны сабе справу з свайго беларускага паходжання, хаця па той зямлі, дзе нарадзіліся, сумуюць і, бадай, да канца жыцця не здолеюць прывыкнуць да новага месцажыхарства, асабліва старэйшае пакаленне.

У сваім штодзённым жыцці шчэцінскія беларусы карыстаюцца польскай, часам „польска-ашмянскай" мовай. Аднак дома часта гавораць па-беларуску, асабліва, калі... спрачаюцца. Сварка пачынаецца словамі „Каб цябе...", а далей можна прыдумаць згодна з сітуацыяй. „Ой, хацела мяне маці ды за першага аддаці" часта можна пачуць з вуліцы ў мястэчках і вёсках ваяводства з нагоды сямейных урачыстасцей.

Шмат беларусаў жыве і працуе ў гарадах. Вучацца ў вышэйшых навучальных установах, працуюць на сучасных прадпрыемствах, часта займаюць кіруючыя пасады.

Пётр Жабскі працуе ў міліцыі. Скончыў вучылішча ў Шчытне, атрымаў афіцэрскае званне. Цяпер хоча паступіць на юрыдычны факультэт Пазнанскага універсітэта, на завочнае аддзяленне. Стараецца не адстаць ад жонкі, студэнткі-завочніцы Шчэцінскага педагагічнага інстытута, якая вывучае там гісторыю, а працуе настаўніцай у васьмігадовай школе.

Калі наша размова перайшла на беларускія справы, Пятрусь вельмі здзівіўся, што ў Польшчы выдаецца беларуская газета. Цяпер заўсёды купляе „Ніву" ў кіёску на чыгуначным вакзале „Шчэцін-галоўны".

Брат Петруся Анатоль працуе на гаспадарцы, недалёка ад Шчэціна. Вельмі любіць коней. У яго іх аж два, але не хоча іх мучыць, таму зямлю апрацоўвае трактарам і іншымі сельскагаспадар-

(Працяг на стар. 4)



БЕЛАРУСКАЯ ПЕСНЯ-76





Мужчынскі калектыў з Дубяжына. Ён заняў першае месца сярод вакальных груп у катэгорыі фальклорнай песні.
Фота Я. Цялушэцкага.

ХРОНІКА

■ У Адрынках (гміна Нарва) гурток БГКТ складаецца з моладзі, якая на справаздачна-выбарным сходзе выбрала новае праўленне ў складзе: Віталіс Анхімюк — старшыня і дэлегат з'езду БГКТ, Ёзік Анхімюк — сакратар, Іван Кулеша — скарбнік, Іван Асташэўскі і Аліна Асташэўская — члены праўлення.

■ У Вялікіх Тыневічах (гміна Нарва) новае праўленне гуртка складаецца з асоб: Сяргей Мартынюк — старшыня, Ніна Леўчук — сакратар, Іван Асташэўскі — скарбнік, Зінаіда Свентахоўская і Анна Галавачук — члены.

■ Члены БГКТ у Барысаўцы (гміна Нарва) на справаздачна-выбарным сходзе кіраваць гуртком даверылі наступным асобам: Івану Якімюку — старшыня, Ніне Ясвіловіч — сакратар, Галене Ціханюк — скарбнік і Андрэю Гарашэўскаму — член. На з'езд БГКТ паедзе Ніна Ясвіловіч.

■ БГКТ-оўцы ў Новай Волі (гміна Міхалова) у склад новага праўлення выбралі: Аляксандра Філіпчука — старшынёю і дэлегатам з'езду БГКТ, Ірэну Івановіч — сакратаром, Уладзіміра Каліноўскага — скарбнікам і Юрку Васько — членам праўлення.

■ У Трывежы (гміна Гайнаўка) у склад праўлення ўвайшлі: Іван Кіцэль — старшыня, Сцяпан Пракапюк — сакратар, Яўген Сахарчук — скарбнік, Міраслаў Давідзюк і Лявон Сахарчук — члены. Дэлегатам на з'езд выбраны Васіль Пракапюк.

■ У Янове (гміна Нарва) склад праўлення прадстаўляецца наступна: Іван Назарук — старшыня гуртка і дэлегат на VIII з'езд БГКТ, Мікалай Леўчук — сакратар, Мікалай Аксенюк — скарбнік, Васіль Пучко і Сцяпан Леўчук — члены.

■ Крывяціцкі гурток БГКТ (гміна Орля) на справаздачна-выбарным сходзе сканцэнтраваў галоўную ўвагу на клубнай дзейнасці з той мэтай, каб у далейшым была яна больш эфектыўная. У праўленне гуртка выбраны: Анатоль Канопка — старшыня, (ён таксама дэлегат на з'езд БГКТ), Іван Кавальчук — сакратар, Тамара Клін — скарбнік і Янка Жураўль — член.

■ Гурток БГКТ у Кошках (гміна Орля) выбраў новае праўленне ў складзе: Аліцыя Фёнік — старшыня, Валянціна Мацкевіч — сакратар, Яўгенія Вярэмчук — скарбнік.

■ У склад нававыбранага праўлення гуртка БГКТ у Храбалах увайшлі: Раіса Дамброўская — старшыня, Славамір Хількевіч — сакратар, Аліна Дамброўская — скарбнік.

■ У Казлах (гміна Бельск) члены гуртка БГКТ выбралі старшынёй — Яланту Гаўрылюк, сакратаром — Яўгенію Аверчук, скарбнікам — Міраславу Данілюк.

■ Пасля справаздачнага даклада і зацвярджэння плана працы да канца бягучага года, члены гуртка БГКТ у Локніцы (гміна Бельск) выбралі новае праўленне: Зінаіда Кучынская — старшыня, Марыя Астапчук — сакратар, Уладзімір Дудзіч — скарбнік, Ніна Сахарчук і Юрка Пракапюк — члены.

■ У Кожыне (гміна Бельск) БГКТ-оўцы, абмеркаваўшы статутовую працу свайго гуртка, прыступілі да выбараў: Андрэй Якімюк — старшыня, Надзея Касцючук — сакратар, Надзея Ваўрэнюк — скарбнік і члены праўлення: Ніна Саковіч (д. Ул.), Ніна Саковіч (д. М.), Марыя Гадомская, Яўген Карчэўскі, Ніна Лук'янюк і Галіна Ваўрэнюк.

■ Гурток БГКТ у Сацах (гміна Нарва) пасля абмяркоўкі працы гуртка і плана працы на бягучы год прыступіў да выбараў новага праўлення. І так, Марыся Буслоўская — старшыня, Канстанцін Марчук — сакратар, Марыя Сегень — скарбнік, Мікалай Кандрацюк і Міхал Максімюк — члены.

НА СТАРОНКАХ БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ

Рэвалюцыйны рух на Беласточчыне

Беласточчына ў XIX і пачатку XX стагоддзях была арэнай многіх рэвалюцыйных падзей, і гэта знайшло адлюстраванне ў БелСЭ.

У 1825 г. Міхаіл Рукевіч (т. IX, с. 172-3), які жыў у вёсцы Завыкі, заснаваў тайнае рэвалюцыйнае таварыства „Ваенныя сябры" (т. II, с. 554). У яго ўвайшлі афіцэры і салдаты часцей рускіх войск, што знаходзіліся на Беласточчыне, а таксама некаторыя жыхары Беластока. Таварыства ставіла сваёй мэтай барацьбу за вольнасць і ўсеагульны дабрабыт. На вестку аб паўстанні дзекабрыстаў у Пецярбургу яго члены выступілі супраць прысягі цару Мікалаю I і выклікалі хваляванні ў войску. Калі гэты рух быў задушаны, М. Рукевіча арыштавалі і прыгаварылі да пакарання смерцю. Потым прысуд быў заменены 10-гадовай катаргай, у часе прабывання на ёй і памёр М. Рукевіч у 1841 г.

З наступным рэвалюцыйным парывам, студзеньскім паўстаннем 1863 г. (т. VIII, с. 350-1), звязана цэлая кагорта нашых землякоў і перш за ўсё братоў Кастуся і Віктара Каліноўскіх (т. V, с. 265-6), што былі родам з маёнтку Мастаўляны. Іх дзейнасць, асабліва Кастуся Каліноўскага — рэдактара „Мужыцкай праўды", арганізатара і кіраўніка паўстання на Беларусі і Літве — шырока вядома на Беласточчыне. Менеі вядома постаць польскага публіцыста, пісьменніка і крытыка Юзафа Таканжэвіча (т. 10, с. 205-6), які быў родам з Бельска (нарадзіўся ў 1841 г., памёр у 1919 г.). Пасля заканчэння Беластоцкай гімназіі паступіў у Маскоўскі універсітэт, але за ўдзел у студэнцкай дэманстрацыі быў арыштаваны і выдалены ў Бельск. У часе паўстання 1863 г. арганізаваў і кіраваў атрадам бельскіх мяшчан. „Пасля разгрому паўстання эміграваў, вучыўся ў Парыжскім універсітэце. Заснаваў „Міжнароднае таварыства польскіх студэнтаў". Рэдагаваў двухтыднёвік „Przyszłość", выдаваў рэвалюцыйна-дэмакратычнае выданне „Gmina". Перапісваўся з Герцэнам, прапагандаваў яго тэорыю абшчыннага сацыялізму. Выступаў за супрацоўніцтва з рускімі рэвалюцыянерамі. Быў пад уплывам рускіх славянафілаў. З В. Урублеўскім і Я. Дамброўскім радыкалізаваў кансерватыўны часопіс польскай эміграцыі „Niepodległość". У 1870 г. у Парыжы выдаваў з В. Расалоўскім і Я. Медэкшам польска-літоўска-беларускі рэвалюцыйны часопіс „Грамадскі зговар". З 1882 г. на радзіме. У 1883-93 г.г. у часопісе „Kraj" (Пецярбург). У 1902-4 жыў на Слонімшчыне ў маёнтку М. Федароўскага, вёў з ім фальклорна-этнаграфічныя даследаванні. Эвалюцыяніраваў ад дэмакратычных матэрыялістычных поглядаў да пазітывізму. Аўтар аповесці „Пан сляпы Павал" (1881 г.) і „Пан глухі Гавал" (1891 г.), успамінаў „У дні вайны і голаду" (1900 г.)".

На Беласточчыне разгортвалі дзейнасць па падрыхтоўцы і правядзенню паўстання 1863 г. Валеры Урублеўскі (т. X, с. 487-8) — інспектар лясной школы ў Саколцы, памочнік К. Каліноўскага ў выдаванні „Мужыцкай праўды", камандзір паўстанцкіх атрадаў і генерал Парыжскай камуны; Ігнат Арамовіч (т. 1, с. 408) — настаўнік Беластоцкай гімназіі, а ў часе паўстання быў ад'ютантам пры паўстанцкім ваенным начальніку Гродзенскага ваяводства. „У Швейцарыі надрукаваў успаміны пра паўстанне на Гродзеншчыне, у якіх апісаў прыезд да паўстанцаў К. Каліноўскага, змясціў тэксты беларускіх паўстанцкіх песень"; Адольф Белакоз (т. II, с. 209) — служачы і музыкант з Беластока, які „актыўна ўдзельнічаў у падрыхтоўцы паўстання, надрукаваў (з Б. Шварцэ) у беластоцкай падпольнай друкарні некалькі рэвалюцыйных выданняў, у т. л. „Гутарку старога дзеда", быў паўстанцкім начальнікам Беластока; Браніслаў Шварцэ (т. XI, с. 314) — інжынер, будаўнік чыгункі Пецярбург-Варшава, кіраўнік Беластоцкай рэвалюцыйнай арганізацыі; Ян Ванькові (т. II, с. 592) — ляснічы ў Белавежскай пушчы, змагаўся ў паўстанцкіх атрадах на Падляссі, потым „у маі 1863 г. узначаліў Брэсцкі паўстанцкі атрад і з Кобрынскім атрадам Р. Траўгута зрабіў рэйд на Піншчыну", а таксама іншыя.

На Беласточчыне разгортваў сваю дзейнасць у 1887-1894 г.г. Гродзенскі рэвалюцыйны гурток (т. IV, с. 23), а таксама ў пазнейшы час — Гродзенская акруговая арганізацыя РСДРП (т. 1, с. 197). Нельга не прыгадаць пры гэтым спецыяльнага артыкула „Беластоцкія стачкі 1895, 1905 г.г." (т. II, с. 273), у якіх чытаем: „1) стачка 1895 г. — адна з найбольшых масавых у 90-я гады 19 ст. Пачалася на тэкстыльных прадпрыемствах у адказ на ўвядзенне разліковых кніжак, у якіх пералічваліся абавязкі рабочых без уліку іх правоў. У ліпені-жніўні стыхійныя хваляванні і забастоўкі прайшлі на ўсіх прадпрыемствах Беластока. 14 жніўня, у дзень увядзення разліковых кніжак, баставала больш за 10 тыс. рабочых. Яны патрабавалі павялічыць заработную плату і палепшыць умовы працы. Голад прымусіў рабочых 9 верасня спыніць забастоўку, хоць іх патрабаванняў не задаволілі. Многія яе ўдзельнікі арыштаваны. Стачка садзейнічала ўздыму рэвалюцыйнага руху ў Расіі. 2) Стачка 1905 г. (12-14 кастрычніка) — палітычная стачка ў час Кастрычніцкай Усерасійскай палітычнай стачкі 1905 г. Пачалася на чыгуначным вузле і неўзабаве перакінулася на іншыя прадпрыемствы горада і павету. Суправаджалася мітынгамі, дэманстрацыямі, сутычкамі з паліцыяй і войскамі. У час стачкі быў выбраны Савет рабочых дэпутатаў, але кіраўніцтва ў ім захапілі эсэры і анархісты, таму яна не перарасла ва ўзброенае паўстанне".

І. Снарскі

Наша галерэя



І. І. Шышкін, „Палескі пейзаж" (Дзяржаўны музей БССР).

TELEWIZJA WARSZAWA

Sobota 24.IV. 6.00 Tech. Rol. Wskaz. met. 6.30 Mat. 7.35 Hasła nie trzeba — film fab. radz. cz. I. 9.00 Dla szkół (kl. VII) Nauka o czł. Sprawy 15-latków. 10.00 (kl. II) Czerw., żółte, ziel. 11.05 (kl. VIII) Geogr. Ze wsi do miasta. 13.45 Tech. Rol. Fiz. 14.30 Bot. 15.30 Red. Szk. zap. 15.40 Pr. I prop. 15.55 Pr. dnia. 16.00 Dzien. 16.10 Obiektyw. 16.30 Leningradzkie wieczory. 16.50 Za kierownicą. 17.10 Sobota Mł. 18.10 Pr. publ. 19.20 Dobr. 19.30 Monitor. 20.20 P. nożna: Francja—Polska. 22.15 Dzien. 22.35 TV Teatr Muz. G. Feydeau — Dama od „Maxima". 23.50 Hokej.

- — -

Niedziela 25.IV. 6.15 Tech. Rol. Fiz. 6.45 Bot. 7.15 Kurs Rol. 7.50 Przyp., radz. 8.00 Alarm przeciwpoż. trwa. 8.10 Now. w domu i zagr. 8.35 Bieg po zdr. 8.50 Pr. dnia. 8.55 Sport. 9.00 TELERANEK. 10.20 Antena. 10.40 Podziemny świat. 11.25 Radar. 11.40 Przegl. polon. 12.10 Dzien. 12.30 Rysie i żbiki. 13.00 Pr. muz. 14.00 Dla dzieci. 14.55 Los. Duż. Lot. 15.10 BANK 440. 16.25 Hokej. 18.45 Canzonissima — film rozr. wł. 19.15 Wieczor. 19.30 Dzien. 20.20 Bajka dla dor. 20.30 Psi węch — film ser. fr. 21.25 Zespół Cygański ROMA. 22.05 BANK 440. 22.40 Sport.

- — -

Poniedziałek 26.IV. 12.45 Tech. Rol. J. pol. 13.25 Mat. 15.50 NURT. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dzien. 16.40 Obiektyw. 17.00 Dla dzieci. 17.40 Echo stad. 18.00 Czwarty tata — nowela film. radz. 18.40 Kółko i krzyżyk — teletur. 19.00 Szare na złote. 19.20 Dobr. 19.30 Dzien. 20.15 Sport. 20.25 Teatr TV: M. Gorki — Mieszczanie. 22.30 Świadkowie. 23.00 Dzien.

- — -

Wtorek 27.IV. 6.00 Tech. Rol. J. pol. 6.30 Mat. 8.00 Brygady Tygrysa — film ser. fr. 9.00 Dla szkół (kl. I) Mat. 10.00 (kl. II lic.) J. pol. A. Czechow — Czajka. 12.55 (kl. lic.) Rodzina współcz. 13.45 Tech. Rol. J. pol. 14.30 Chem. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dzien. 16.40 Obiektyw. 17.00 Przed ekranem. 17.30 Gospodarność i ja. 17.45 Wielka woda. 18.15 Studio Mł. 19.20 Dobr. 19.30 Dzien. 20.15 Sport. 20.25 Przyp., radz. 20.30 Górnicy — film ser. ang. 21.10 Interstud. 21.55 Jak za dawnych lat. 22.10 Dzien. 22.25 Lekt. Pegaza. 22.45 Wieczorne serenady.

- — -

Środa 28.IV. 6.00 Tech. Rol. J. pol. 6.30 Chem. 9.00 Dla szkół (kl. VII) Chem. Ważny kwas. 9.30 Górnicy — film ser. ang. 11.05 Dla szkół (kl VIII) Fiz. 12.00 (kl. VIII) Chem. Cement. 12.45 Tech. Rol. J. pol. 13.25 Mat. 14.40 Kurs Przyg. Fiz. 15.50 NURT. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dzien. 16.40 Obiektyw. 17.00 Dla dzieci. 17.30 Los. Mał. Lot. 17.45 Wiązanie kolorów. 18.00 Pr. estrad. 18.15 Kto ma rację. 19.20 Dobr. 19.30 Dzien. 20.15 Finał Pucharu UEFA. 21.45 Stud. Muz. Rozr. 22.00 Listy i polit. 22.45 Dzien.

- — -

Czwartek 29.IV. 6.00 Tech. Rol. J. pol. 6.30 Mat. 9.00 Mściciele — film fab. radz. 12.00 Dla szkół (kl. VIII) J. pol. J. Tuwim. 12.30 Decyzje piętnastolatków. 13.45 Tech. Rol. Mat. 14.30 Hod. zwierz. 15.05 Mat. w szk. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dzien. 16.40 Obiektyw. 17.00 Ekran z brat. 18.05 Poligon. 18.30 Anatomia sukcesu. 19.20 Dobr. 19.30 Dzien. 20.15 Sport. 20.25 Przyp., radz. 20.30 Teatr Kobra: F. N. Hart — Wszyscy mówią prawdę cz. II. 21.25 Pegaz. 22.10 Dzien. 22.25 Podróże z HAGAWEM.

- — -

Piątek 30.IV. 6.00 Tech. Rol. Mat. 6.30 Hod. zwierz. 9.00 Dla szkół (kl. III) W odwiedzinach u żubra. 9.15 Ich dwoje i chłopiec — film fab. bułg. 11.05 Dla szkół (kl. I—III lic.) Wych. tech. 12.00 (kl. VIII) Wych. ob. 12.45 Tech. Rol. Mat. 14.40 Kurs. przyg. Mat. 15.50 NURT. 16.00 Red. Szk. zap. 16.10 Pr. I prop. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dzien. 16.40 Obiektyw. 17.00 Dla dzieci. 17.35 Zrób to sam. 18.00 Przez maskę płetwonurka — film ser. fr. 18.25 Sport. 19.20 Dobr. 19.30 Dzien. 20.15 Sport. 20.25 Chłodnym okiem — film fab. USA. 22.15 Drogowskazy. 23.00 Dzien. 23.15 Halina Kunicka zaprasza.

ТЭЛЕВІЗІЯ МІНСК

Piątek 23 kwietnia — 8.00 Film dok. o A. Twardowskim. 14.00 Film fab. 16.15 Film anim. 17.00 Hokej. 19.45 Koncert. 20.30 Hokej.

Sobota 24 kwietnia — 8.30 Koncert. 10.10 Koncert. 13.10 Film fab. 14.50 Filmy anim. 17.30 Film sens. 19.30 Śpiewa K. Szulżenko.

Niedziela 25 kwietnia — 9.00 Koncert dla dzieci. 13.00 Hokej. 16.15 ZSRR w oczach obcokrajowców. 16.30 Hokej.

КІНО

Białowieża Dzień szakala — ang. 27—28. To jeszcze nie miłość — NRD 29—30.

Czyże Fraulein doktor — jug. Jezioro starej sowy — NRD 28.IV—2.V.

Dubicze Cerkiewne Aresztuję cię przyjacielu — fr. Zielona ściana — per. 28.IV—2.V.

Kleszczele Wniebowstąpienie — pol. 27—28. Legenda o Paulu i Pauli — NRD 29—30.

Michałowo Aresztuję cię przyjacielu — fr. 27—28. Ciemna rzeka — pol. 29—30.

Mielnik Tajemniczy blondyn w czarnym bucie — fr. 28.

Milejczyce Dramat zazdrości — wł. 27—29.

Narew Kartka z młodzieńczych lat — radz. 28.IV—2.V.

Narewka Urodziny Matyldy — pol. El Dorado — USA 28.IV—2.V.

Nurzec Pokój przechodni — NRD 27—28. Kalendarz warszawski — pol. 29—30.

Orla Dzieje grzechu — pol. Michaś przywołuje świat do porządku — RFN 28.IV—2.V.

Rajsk Kochankowie roku pierwszego — czes. Śmiałość — radz. 28.IV—2.V.

B.Z.Graf. Zam. 1044 F-2

Фёдар Хлябіч

Наша вёска

У Рыбаках я нарадзіўся,
У прыходзе Юшкаў Груд,
З вёскаю сваею зжыўся,
І цяпер жыву я тут.

Калі меў чатыры рокі,
Ашчэ нават не спаўна,
Выязджаў я ў свет далёкі,
Бо была тады вайна.

І такой, як наша вёска,
Я не бачыў больш нідзе.
Лесам хадзіў я падросткам,
Плываў у Нарве па вадзе.

Наша вёска амаль у доле
Пад нестромкаю гарой.
На гарэ прысела школа,
Крыху быў і я у ёй.

На гарэ ест камяніца,
Там гуляе, хто малы.
Выплываюць дзве крыніцы
З-пад пясчанае гары.

У нашай вёсцы дваццаць
хатаў,
А на поўнач расце лес,
Гуліца ў нас крывавата,
Чыста так, як буква „С“.

За ракой Лука наўпроста,
Крыху нават на сукос,
А за грэбляй і за мостам
Урочыска Перавоз.

Назад лет дзесяткаў пара
Каля грэблі быў тапол,
А пад ім карчма стаяла
І быў Носкаў манаполь.

Стары двор стаіт высоко
Густымі ліпамі зарос.
На усход, чуць бачыць вока,
Праз раку жалезны мост.

Мост жалезны ашчэ новы,
Паязды па ім ідут.
Груд сасновы там й кляновы
І харошы Дубоў груд.

І Цясноўскія бярозкі
Выглядают з-за гары,
Рыбакам суседні вёскі —
Гарбары і Бандары.

За ракою ад палудня,
У том баку найзляней,
Вёска Боўтрыкі і Рудня,
Гэта ўжо аднак далей.

Як жыта усе паспеют,
Як іх скосят касары,
То з далёка завідніеют
Будніцкія хутары.

Над вадой чарот зялёны,
Сходзятся тут рэчкі.
На выгане ходзят коні,
Пасуцца авечкі.

У Рыбаках з аднаго боку
Альшына стаіт, як тын.
Пад альшынаю шторку
Адбываецца хвэстын.

Від на захад у нас карoткі
Нават летняю парой.
Тут расселася Слабодка
Пад Мацейкавай гарой.

І таксама недалёка
Пры дарозе Багнюкі.
Хаты ўсе з аднаго боку,
Усе з таго, што ад ракі.

Руднік цячэ у Нарву вольна,
Дзе на ём ляжыт масток.
Горна Таніца і Дольна
Ад нас таксама у той бок.

Ува ўсе бакі абраз мілы,
Дзе радзіўся чалавек.
У нас пад лесам крыж пахілы
Дажывае сівы век.

Валасы

Многа лет ужо я маю,
А здаецца малады.
Маладым не патураю —
Не нашу я барады.

Вусы часта падбрываю,
Падстрыгаю валасы,
Каўтуноў доўгіх не маю,
Каўтуны не для красы.

Для выгады й для парадку
Касцюм, туфлі і часы,
А калі ашчэ краватку —
Яна будзе для красы.

Да вайны

Да вайны людзі у вёсцы,
А таксама абы-дзе,
Жылі ў пастаяннай тросцы,
Часам нават і ў бядзе.

Хоць патрэбу мелі вельку,
Трудно было грош здабыць.
Шлі да лесу й на арэльку,
Каб канец з канцом стачыць.

Хоць пакрыта зямля снегам,
На дварэ хоць халадно,
У воду ўлазілі з адбегам,
Як не хопіт шрык за дно.

Убівалі ў бераг леску,
У Тыкацін задам ішлі,
І у пушчу Белавежску
На плячах клумок няслі.

Вытапталі ўсе дарогі,
Па далінах й па гарах,
Шматпакутніцкія ногі
У гумовых пасталах.



Фота Я. Цялушэцкага.


Пра Фёдара Хлябіча з Рыбакоў мы дагэтуль нічога не ведалі, хоць і аціраліся побач. І калі яго вершы трапілі ў рэдакцыю, за пачуццём радасці, што аб'явіўся новы талент, прыйшло і засмучэнне: чаму так позна? У гэтым дзядзька Фёдар не вінаваты. Ён па натуры надзвычай скромны і добры чалавек. Яго вершы — біяграфія роднай вёскі. І піша ён яе не дзеля славы, а так сабе. Піша з апаскай, не кожны, з каго бярэ партрэт, будзе майстрам задаволены. Некаторыя могуць пагнявацца. Таму не многім выяўляе свае палотны. І каб чулая на прыгажосць душа з Міхалова не ўгаварыла дзядзьку Фёдара выслаць гэтыя вершы ў „Ніву“, відаць, мы іх не ўбачылі б. Вось і тэма для разважанняў у перадз'ездаўскі „банк думак“. Адступаю яе нашым актывістам.

Вершы Фёдара Хлябіча дыхаюць нескажоным літаратурнымі смогамі паветрам, яны ўвабралі ў сябе прыродную чысціню паўнаводнай Нарвы, узгадаваны пад асвяжаючай зелянінай яе берагоў. Не заўсёды гэтыя берагі былі ласкавыя. Паэт нарадзіўся ў 1911 годзе. Ужо чатырохгадовым хлапчуком скаштаваў горкі бежанскі хлеб над берагамі Волгі. І мілейшай вёскі, як Рыбакі, не ўбачыў нідзе. Вярнуўся на родны бераг, хоць той не абяцаў раскошаў. Чатыры класы пачатковай школы, што прысела на гары, не адкрывалі дарогі ў свет. На гэтых класах і канчалася адукацыя рыбакоўскіх падросткаў. Больш класаў у вёсцы не было. Па вады ў далёкія мясціны ніхто дзяцей не высылаў, бо людзей прыціскала бяда і яны стапталі гумовымі пасталамі берагі Нарвы ў пошуках якога-колечы заробку. І рака не дала ім памерці. Яна выкарміла і вершы паэта. Ад таго яны такія крынічныя і мудрыя.

Фёдар Хлябіч дазволіў надрукаваць гэтыя вершы з агаворкай: „калі яны маюць сэнс“. Ён таксама не ўпэўнены, ці яго вершы, так моцна звязаныя з Рыбакамі, выклічуць зацікаўленне ў іншых вёсках. Мы пераконвалі: напэўна (у гэтым ваша сіла!). Ці пераканалі — не ведаем. Зноў свярбіць язык, каб упікнуць нашых актывістаў (адгукніцеся, маўляў), але ведаючы іх „актыўнасць“ у водгуках, лепш змоўчым і будзем спадзявацца, што дзядзьку Фёдара і так удалося нам пераканаць у вялікім „сэнсе“ яго вершаў.

Г. В.

„А йшлі, прайшлі валачобнікі...“



Так... Прайшлі і адыйшлі разам з мінулай тысячагадовай эпохай сельскай натуральнай гаспадаркі з валамі і сахою, сярпом і цэпам, верацяном і кроснамі. Але іх сляды — квяцістыя і пераліўчатыя — па сённяшні дзень засталіся ва ўспамінах старэйшых жыхароў Беласточчыны, асабліва ў мясцовасцях паміж рэкамі Бебжай і Нарвай. Даволі трапіць на вясковую вуліцу ў ваколіцах Новага Двара, Сухаволі, Саколкі, Суража, Беластока, Гарадка, Заблудава ці Нараўкі, падысці да сівенькага дзядулі, што прысеў на коўбычку каля хаты і падставіў твар пад праменні ласкавага веснавога сонейка, ды запытаць: „Ці вы калісьці валокалі?“, а ён гляне на вас і ў яго вачах зацепляцца іскрынкі любых успамінаў з адлеглай маладосці: „А як жа ж, — скажа. — На кожны Вялікдзень, з году ў год, аж пакуль ажаніўся! Бывала...“

І паплыве нетаропкае красачнае апавяданне-згадка пра колішніх валачобнікаў, сярод якіх не апошняе месца займаў і наш расказчык. Вось бачым мы яго ў грамадцы разадзетых па-святочнаму вясковых хлопцаў — „кавалераў“. Яны падзяліліся ролямі: найбольш галасісты — гэта запявала, далей — скрыпач або гарманіст, затым — дужы дзяціна з торбаю на пачастункі, ну і рэшта — харысты. Выйшлі на вуліцу. Для пробы музыка расцягнуў мех гармоніі і звітна праехаўся пальцамі па ладах, заліўся звонкім голасам запявала, а за ім заспяшаліся харысты. Вычышчаная, вымеценая і выбеленая святочная вёска, здаецца, аж усміхнулася ім бляскам сваіх маленькіх шыбін.

У хатах скрыпнулі дзверы і цікаўныя вочы, ідучы за вясёлай грамадой, губляюцца ў здагадках: „Ад каго ж пачнуць сёлета валачобнікі?“ Але яны не адступаюць ад заведзенага парадку: пачынаюць з крайняй хаты, бо хоць там гаспадар і беднаваты, затое Марыся-дачка ў яго, бы ружа. Расхіліліся веснічкі, цяўкнуў Жулік і схаваўся за свіронкам, а ўжо пад акном пераліваецца голас запявалы: „Гэй, дзень добры, паненэчка!“, харысты ж басуюць: „Гэй, віно, віно зелено!“ і паплыла песня аб красе дзяўчыны ды з пажаданнямі ёй хуткага выхаду замуж за любага. Але валачобнічкі не забываюць і пра сябе, гаворачы ў канцы песні пра багаты пачастунак „белым сырам абложаны“, „кілбасою акружаны“ ды „бутылкаю завершаны“. Распраменeная дзяўчына выходзіць з поўнаю талеркаю ў руцэ, а тыя, глянуўшы на нескупы дар, зараз жа сплятаюць з рук „столачак“, садовяць на яго дзяўчыну ды гушкаюць аж пад глыбокі блакіт вясенняга неба. Звоніць радасны дзявочы смех, цешацца, стоячы каля акна, маці з бацькам, што іх дачку хлопцы паважаюць. А калі гушканні закончаны і дар схаваны ў бяздоннай торбе, вясёлая грамадка ўжо пад акном у суседа.

Тут дзяўчаткі яшчэ малыя, таму валачобнікі пяюць пра паву, што „ходзіць па гуланьцы“ ды „роніць пер'е па мураўцы“, але гаспадыня тут дбайная, бо пер'е „збірае“ і „ў хусту складае“ ў пасаг сваім дочкам, а ўжо „тры малойцы-рыбалоўцы“ уюць ім „венец“ і, як глянь, „ідуць у танец“. І цяжка гаспадыні адмовіць пачастунку за такія пажаданні.

Пад вокнамі трэцяй хаты ў песні гаворыцца пра багатага гаспадара, у якога вакол двара „тын тыновы“, „сад вішнёвы“, „вароцечкі букавыя“, „замочкі ўнутраныя“, „а ключыкі залатыя“. Усялякага дабра ў яго гара-гарою і жыве ён шчасліва. Нічога, што напрадвесні ў гэтай хаце, як у большасці сялян, няма чаго і на зуб пакласці, але ў песні-казцы ўсё магчыма.

І ўсё ж цэнтральным героем валачобных песень з'яўляецца „красная паненка — вясна“. Гэта яна чарадзейнымі ключамі адамкнула зямлю і ваду, абудзіла да жыцця прыроду, дала надзею на новы ўраджай. І якраз услаўленне працы на гаспадарцы — гэта асноўны іх

(Працяг на стар. 4)

ЗНОЎ АЖЫЎЛЕННЕ Ў ГОК

(Працяг са стар. 1)

сталіся вялікай папулярнасцю ў гледачоў. Гэты калектыў прымаў удзел у кожным аглядзе Беларускага грамадска-культурнага таварыства.

У Доме культуры адбываліся цікавыя сустрэчы з народнай гафцяркай Зофіяй Каспэрук, расказчыкам Station Станіславам Гроцкім, мастаком — Рамуальдам Грыкам, салісткай Любай Ярмолік, спевакамі-аматарамі Аляксандрам Ваўрэнюком і яго жонкай ды іншымі здольнымі людзьмі: майстрамі жывога слова, здольнымі песнярамі.

Клуб „Рух“ пад кіраўніцтвам Валянціны Крупіцкай вёў шырокую і ўсебаковую дзейнасць. Маладыя дзяўчаты і хлопцы ахвотна збіраліся ў ім, каб падыскутаваць на цікавыя тэмы: „Калі б гэта ад мяне залежала“, „Нашыя равеснікі на свеце“, „Ці варта быць лепшым?“ і г.д.

Пры клубе дзейнічаў адзіны ў нашым ваяводстве і адзін з нешматлікіх у краіне вясковы дыскусійны фільмовы клуб (ДКФ). Налічваў ён больш паўтары сотні асоб і вёў багатую дзейнасць. У кожны панядзелак дэманстраваліся добрыя кінафільмы. Пасля іх адбываліся дыскусіі пры шклянцы кавы. Моладзь выказвала свае погляды, давала ацэнку паступкаў герояў фільма і пераносіла яго да жыцця. На сустрэчы з кіналюбіцелямі прыязджалі вядомыя польскія рэжысёры, м.інш., Януш Моргенштэрн і кінаакцёр Уладзіслаў Кавальскі.

Прыязджалі сюды на сустрэчы лектары, пісьменнікі, журналісты, літаратурныя крытыкі.

Самадзейнікі збіраліся ў клубе на рэпетыцыі беларускіх п’ес. Усе іншыя наведвальнікі прыходзілі знаёміцца з выдавецкімі навінкамі, савецкім жывапісам. Наштодзень тут можна было б прачытаць свежую прэсу, паслухаць добрую музыку, глядзець каляровыя тэлеперадачы, сустрэць сяброў, пагаварыць і выпіць чай або каву.

У 1972 годзе міхалоўскі клуб заняў другое месца ў ваяводстве ў конкурсе на найлепшы клуб.

Усё спынілася ў ГОК-у, калі не стала дырэктара Р. Варабея. Пасля яго змяніўся адзін дырэктар, потым другі. Заглох радыёпрыёмнік, тэлевізар, магнетафон, былі папсаваны фотаапараты і музычныя інструменты. І ніхто іх не рамантаваў.

Пачаў працякаць дах, і ў сярэдзіне будынка паявіўся грыб.

Спынілася дзейнасць, а пасля ўвогуле існаванне якіх-колеч калектываў і гуртКоў зацікаўленняў. ДКФ — „вочка“ ранейшага кіраўніцтва і мясцовай інтэлігенцыі таксама, на жаль, распаўся. Словам, маразм. Усё зацiхла, заняпала. Прычына — змена аднаго чалавека.

Цяпер пачаў працаваць у ГОК у Міхалове трэці па Р. Варабею дырэктар Адам Вантруцкі.

Паколькі неабходна было рамантаваць будынак і ўсё клубнае абсталяванне, ён узяўся за рамонт. Раздабыў ужо некаторыя музычныя інструменты (новае піяніна, тры электрычныя гітары і іншыя), прывёз адрамантаваныя фотаапараты, магнетафон. Хоча апаражніць два пакойчыкі, у якія гмінная ўправа перанесла свой архіў, крэслы і іншую мэблю. Бо хіба ж не з той мэтай пабудаваны ГОК? А ў Доме культуры і так цесна.

Новы дырэктар намераны вярнуць ранейшы ранг ГОК. Мае запас добрых думак, якія хоча ажыццявіць. Склікаў ён новую грамадскую раду Дома культуры. Пачаў ужо дзейнічаць ДКФ. З дапамогаю ў ажыўленні культурна-асветнага жыцця прыйшлі члены мясцовага гуртка БГКТ.

Валя Крупіцкая пачала заняткі з дзецьмі, якія вельмі любяць рысаваць і якія ўжо рыхтуюць лялечны спектакль.

Янка Цялушэцкі

(Працяг са стар. 3)

„А йшлі, прайшлі валачобнікі...“

матыў. У песенных вобразах-пажаданнях гаворыцца аб жыце, што „трубою ўецца“, аб цяжкім наліўным калоссі, аб увесістых снапах і густых тарпах, аб „жывінцы“, якая ад жыру „па лузе брыкае“. Словам, аб тым фантастычна багатым свеце, які мог паўстаць толькі ў выдумцы селяніна-бедняка, замучанага непасільнаю работаю ды вечнай галечай і нястачамі. Але ўсё ж валачобныя песні аптымістычныя, вясёлыя, бадзёрыя, бо „на ўвесь свет вясна-красна прыйшла“!

Толькі познім вечарам закончылі свой абход валачобнікі. Уславілі тых, хто на пачастункі не паскупіўся, абсмяялі скнэраў і скупіндзяяў, якія не абдарылі іх належна. Цяпер час на падзел сабранага ў торбе і забаву. Доўга за поўнач будзе чуваць у карчме вясёлая музыка, песні, жарты і смех. А калі закончацца велікодныя святы, зноў пацягнуцца знясільваючыя шэрыя дні за сахою ды кроснамі і скупы стол, бо кожны фунт мукі і кожная бульбачка на ўліку ды з думкай „абы адно дацягнуць да ўмалоту з новага ўраджаю“.

Прайшлі і адышлі назаўсёды валачобнікі...

(іс)

(Працяг са стар. 1)

БЕЛАРУСЫ НА ЗАХОДНІМ ПАМОР’І

чымі машынамі. Нядаўна ён вярнуўся з Беларусі, дзе быў з жонкай у гасцях у сваякоў у Зельвенскім раёне на Гродзеншчыне.

— Найсмачнейшая рыба водзіцца ў Зяльвянцы, — аўтарытэтна сцвярджае ён, — вада, як крышталь...

Рыгор Назарскі працуе адным з кіраўнікоў вялікага прамысловага прадпрыемства аднаго з былых павятовых гарадоў. Да нядаўна меў сярэднюю адукацыю, скончыў дваццаць гадоў таму назад беларускую дзесяцігодку. Усе цягнуцца да ведаў, і Рыгор рашыў стаць студэнтам. Цяпер ён ужо на другім курсе... педагогікі Слупскага педагагічнага інстытута. На маё здзіўленне выбарам кірунку навучання адказаў:

— Здзіўляешся, чаму выбраў я не палітэхнічны, а педагагічны інстытут? Бачыш, за дваццаць гадоў працы на адным месцы тэхнічныя справы ведаю, але не менш важныя на кожным прадпрыемстве адносіны паміж людзьмі. І адчуваю, што ведаў у гэтай галіне ў мяне не хапае. Таму педагогіка... І не шкадую...

Цяжка з гэтым не згадзіцца. Добра было б, каб усе кіраўнікі прамысловасці мелі абавязак пазнаёміцца з педагогікай. Гэта было б толькі на іх карысць. Людзі і іх справы важнейшыя, чым самыя складаныя машыны.

Разам з жонкай, настаўніцай рускай мовы, часта бываюць у СССР. Падарожнічалі па Каўказе, былі ў Маскве і іншых савецкіх гарадах.

— Восенню я быў у камандзіроўцы ў Варшаве і купіў на Новым Свеце „Ніву“, — кажа Іван Мартынюк, дзеяч настаўніцкага прафсаюза, — і вельмі здзівіўся, што колькасць вучняў на ўроках беларускай мовы на Беласточчыне малее. Людзі заўсёды такія... Не цэняць таго, што маюць. Калі б я меў магчымасць знайсці тут настаўніка беларускай мовы, з вялікай прыемнасцю пасылаў бы да яго на прыватныя ўрокі сваіх дочак. Сам ужо пачаў забываць — скардзіцца ён.

Як відаць з гэтага, на Заходнім Памор’і ёсць, жывуць і працуюць беларусы. Колькі іх? Цяжка сказаць. Добра было б, каб Галоўнае праўленне БГКТ зацікавілася гэтай справай і памагло стварыць шчэцінскі аддзел таварыства. Украінскі аддзел ужо даўно дзейнічае, а ці ж мы горшыя?

Алесь Самаровіч

БГКТ на Гайнаўшчыне

Паспяхова прайшла справаздачна - выбарная кампанія на Гайнаўшчыне. Праводзілі яе ў асноўным маладыя актывісты.

На гэтых сходах многа ўвагі было звернута на паляпшэнне працы гурткоў.



Анеля Навіцкая са Скупава — адна з найлепшых актывістак БГКТ на Гайнаўшчыне. Дасканалы арганізатар. Вучыцца ў гайнаўскім белліцэі. Дэлегат на з’езд.

Запланаваны грамадскія чыны, вечарыны, прысвечаныя VIII з’езду БГКТ, акадэміі, сустрэчы, конкурсы і г.д.

Напрыклад, Скупава. Ёсць тут прыгожы клуб, у якім канцэнтруецца ўсё культурнае жыццё вёскі. Дзейнічае тэатральны гурток. У яго цікавая праграма і ведае яго ўся ваколіца. Асабліва скупаўская моладзь вылзяляецца ў арганізацыі грамадскай працы на карысць вёскі.

Тое самае можна сказаць і пра Вітава. Тут папулярны вечарыны. Сёлета вітаўляне арганізавалі супольную сустрэчу Новага года. Былі песні, вершы. Не ўступаюць і ў грамадскіх чынах, апякуюцца помнікамі II сусветнай вайны. Праца магла б быць яшчэ цікавейшай, каб быў тут нейкі культурны пункт. Няма тут ні клуба, ні святліцы. На жаль, гміна гэтай справай зусім не цікавіцца.

Чыжы. Тут на ініцыятыву насць ніхто не скардзіцца. Вырасла „Зялёная святліца“. Адкрыў яе народны фэстын з кніжным кірмашом і шматлікімі іншымі мерапрыемствамі.

Многа чаго зробім у гэтым годзе, у час святкавання бэгэкатоўскага юбілею. Усім вядома, што БГКТ на Гайнаўшчыне з’яўляецца самай актыўнай культурна-грамадскай арганізацыяй. Але самі многа мы не зрабілі б. Наша сіла ў цесным супрацоўніцтве з усімі арганізацыямі, якія дзейнічаюць у нашым асяроддзі, у пастаянным кантакце з партыйнымі і адміністрацыйнымі ўладамі, з дырэктарамі ГОК-аў і настаўнікамі. Ад усіх іх атрымліваем усебаковую дапамогу і за гэта ім вялікае дзякуй.

Віктар Бура



Тамара Скепка — актывістка з Вітава, дэлегат на з’езд.



Анатоль Ціханюк — прыкладны актывіст з Чыжоў. Вучыцца ў гайнаўскім белліцэі.



Славамір Паўлоўскі — старшыня гуртка ў Рэпісках, дэлегат на з’езд.



НАШАНІЎСКАЯ ПАРА

ЦІШКА ГАРТНЫ — ЧАСТКА XVII

Жыццёвае і творчае credo. Ужо разгледжаныя намі вершы Гартнага аб змаганні і барацьбе можна па сутнасці аднесці да вершаў праграмных. Зараз разгледзім тыя творы, у якіх пісьменнік звяртаецца толькі да самога сябе, акрэслівае сваю жыццёвую або творчую філасофію, сваю праграму, свае прынцыпы і погляды. Гэта наступныя вершы: „Хоць чароўна ты, неба, усягды“, „Ой, падуй ты, вецер“, „Не хачу забыцца“, „Не пакінь ты, надзея, мяне“, „Просьба“, „Я бачыў яе аддалёк“, „Бунт“, „Я хацеў бы непакорным“, „Мой верш“, „Хоць нядоля мяне“, „Паэта, маці і муза“.

У вершах „Хоць чароўна ты, неба, усягды“, „Ой, падуй ты, вецер“, „Не хачу забыцца“ „Бунт“, „Пазыў“, „Хоць нядоля мяне“ Гартны за выяўленне сваіх поглядаў і ідэй выкарыстоўвае такія прыродныя з’явы, як вецер, вада, неба, зоркі, сонца і г.д.

У вершы „Хоць чароўна ты, неба, усягды“ аўтар задумоўваецца над тым, куды яму скіраваць свае зацікаўленні — у неба ці на зямлю. На гэтае пытанне аўтар адказвае адназначна. Дэкларуе ён сваю прывязанасць да зямных, чалавечых спраў. Статычная, вечная прыгажосць неба не вабіць паэта. Брыдота канкрэтных чалавечых клопатаў бліжэйшая яму, чым абстрактнае хараство нябёсаў.

На зямлі, на халоднай, сырой,
Дзе ні зорак, ні сонца няма,
Дзе нядоля і цьма,
Я шчаслівейшы душой.

Так можа гаварыць толькі паэт-грамадзянін, і таму грамадскія матывы, мабыць, найбольш характэрныя для жыццёвай і літаратурнай праграмы Гартнага.

Трэба аднак падкрэсліць, што ў праграмных вершах паэта выступаюць пэўныя непаслядоўнасці. І так, верш „Хоць нядоля мяне“ ўтрыманы ў атмасферы досыць абстрактнага захаплення прыродай і беспрадметным віталізмам. Можам сказаць, што верш гэты выразна запярэчвае ідэі ўжо прадстаўленага верша „Хоць чароўна ты, неба, усягды“. Там аўтар выразна адварочваўся ад неба ў бок грамадскіх спраў — тут, наадварот, рвецца ў неба. Вось фрагмент гэтага верша:

Жыць у ветры начным,
З лёгкаю хмаркаю там,
У прасторы глухім,
Мкнуцца ў даль к ваблакам,
Зоры й месяц лавіць...


Паэт выразна атоесамліваецца з ветрам, з хмаркаю, з зоркамі і месяцам і не падкрэслівае сваёй сувязі з нейкімі грамадскімі праблемамі. Значыць, што праграма пісьменніка складаецца не толькі з зацікаўленняў сацыяльнымі справамі, але і захаплення прыродай. У гэтым няма нічога дзіўнага. Усебаковасць паэтычнай натуры якраз і праяўляецца ва ўменні любіць агульнае і індывідуальнае, чалавечае і прыроднае, зямное і нябеснае.

Характэрны для праграмнай лірыкі Гартнага таксама верш „Не хачу забыцца“. Вось яго першая і апошняя строфы:

Не хачу забыцца я ў цудоўных марах,
Каб не мець ніякіх думак ды клапотаў,
А сядзець бязмоўна у салодкіх марах,
Апоены макам ціхое дрымоты.

...Не прашу спакою, не прашу забыцця, —
Бо жыццё заўсёды ў цішы замірае, —
А прашу я буры, бо ад буры жыццё
З сілаю магутнай біцца пачынае.

З прыведзеных фрагментаў выразна бачым, што ў гэтым вершы ідэя грамадскай дынамікі з’яўляецца найважнейшай. Служба грамадству — гэта галоўны матыў амаль усіх вершаў Гартнага, якія мы залічылі да цыкла жыццёвага і літаратурнага credo.



Міхал Байко сярод экспанатаў.

Зберагчы для нашчадкаў

Мяняюцца часы, багацеюць вёскі. Тэлевізары, халадзільнікі, пральныя машыны — усё гэта і многа чаго іншага можам знайсці сёння амаль у кожнай нашай хаце. Дзе ж там цяпер месца ўсялякім калаўротам, жорнам, прасам на вугаль. Ляцяць яны ў розныя закамаркі свіронкаў, павецяў, а ды яшчэ горш, проста на пункт збору злому ці ў печ. Як жа незаслужана!

Многа такіх прадметаў выратаваў перад знішчэннем інж. Міхал Байко з Белавежы, які стварыў у сваім доме амаль сапраўдны этнаграфічны музей. Ён з захапленнем збірае ў ваколіцы ўсе непатрэбныя ўжо ў гаспадарцы рэчы, чысціць іх і памяшчае на адпаведным месцы ў пакоі, у якім ужо робіцца цеснавата. Нічога дзіўнага, бо пакой маленькі, а экспанатаў назбіралася да гэтага часу звыш 60 штук. Ёсць тут і камплектныя жорны, зробленыя незадоўга перад пачаткам I сусветнай вайны, і медзяное карыта з 1849 г. з аснашчэння белавежскага царскага палаца. Цікава выглядае аздоблены куфар з 1890 г., з якім ішоў калісьці кожны мужык на 25-гадовую службу ў царскай арміі. Сярод экспанатаў, якія паходзяць з перыяду да 1915 г., варта назваць тапор для склюдавання бярвенняў, драўляны прыбор для распальвання агню, перароблены на ручны дрыль, калаўрот, кадлубкі, капанькі. З перыяду паміж войнамі паходзяць 4 прасы на вугаль, лапці, зробленыя з пакрышак, драўляныя канькі з металічнай акоўкай, латуневая ступка для сцірання перцу, 2 газавыя лямпы (адна польская, другая руская), прасніца, бамбукавая этажэрка і інш.


Летам М. Байко думае павялічыць свой збор на кросны, якія паабяцала яму ўжо Юсціна Бушко, дзве бараны (адна з драўлянымі зубамі) ад Юрыя Валкавыцкага, сяброўка ж прывязе беларускую вышываную мужыцкую кашулю. Шэраг прадметаў даставілі яму дагэтуль Вольга Мілько, Мікалай Бушко і памершая ўжо Варвара Байко.

Апрача даўнейшых рэчаў хатняга ўжытку М. Байко збірае таксама старыя кніжкі і карты. Самымі каштоўнымі ў калекцыі з'яўляюцца старацаркоўны псалтыр з 1904 г., царская кулінарная кніга з 1900 г., карта генеральнага штаба, прадстаўляючая еўрапейскую частку Расіі з 1915 г., і руская карта Белавежскай пушчы з 1907 г. Вялікую вартасць прадстаўляе сабой кніжка Баранава „Падручнік для фельчараў", якая мае зроблены ўручную надпіс, растлумачваючы, што кніжка належыць кіраўніку лазарэта штабс-капітану Якаву Вашкевічу. На жаль, некалькі вырваных старонак перашкаджае вызначыць, у якім годзе яна выдана, хаця, мяркуючы па правапісу і зместу, было гэта не пазней 1900 г.

Міхал Байко з'яўляецца настаўнікам у Механічным тэхнікуме ў Гайнаўцы. Ён выпускнік ВСІ ў Беластоку (1974 г.). Цяпер яму 27 гадоў. Захапленне матэрыяльнай і духоўнай беларускай культурай паявілася ў яго ўжо ў дзяцінстве, калі слухаў апавяданні бацькоў і старэйшых жыхароў аб мінулым сваёй ваколіцы. Дзякуючы такім людзям, як інж. Міхал Байко, можам верыць, што гісторыя нашай нацыянальнай культуры праіснуе стагоддзі.

Калі будзеце выкідаць нейкі стары і непатрэбны прадмет, падумайце аб белавежскім калекцыянеры.

Тэкст і фота
Пятра Байко



Фрагмент калекцыі.

ФАЛЬКЛОР

ВЯСЕЛЬНАЯ



Розвіваецьсе, розвіваецьсе мята-рута і зіеле,
зачынаецьсе, зачынаецьсе ў Гандюлі вэсіеле.
Вышла Гануля за вороточка, той россыпала дрова,
ой, мінаецьсе, ой, мінаецьсе вся дівоцька розмова.
Вышла Гануля за вороточка, той россыпала карты,
ой, мінаюцьсе, ой, мінулісе все дівоцькіе жарты,
ой, мінаюцьсе, ой мінулісе все дівоцькіе жарты.

Ад Веры Іванюк, 1910 г. нараджэння, Надзеі Федарук, 1911 г. нараджэння, і Ніны Васілюк, 1934 г. нараджэння, вёска Плёскі гм. Храбалы, запісаў 5 лістапада 1975 г. М. Гайдук. Нотная транскрыпцыя з магнетафоннай стужкі Людмілы Панько.



Я БЫЎ У ГРУЗІІ Ў ДВАЦЦАЦЬ ПЕРШЫМ

Ваша газета мяне вельмі цікавіць, і я яе часта чытаю, хаця не выпісваю. Я ж жыву аж у трох кіламетрах ад пошты і не хачу затрудняць лістаноша — яму ж і так работы хапае. Проста ў кожную пятніцу я даю сваім унукам грошы, а яны ж ходзяць у школу і там, у кіёску, купляюць мне „Ніву".

І вось у газеце ад 28 сакавіка гэтага года я прачытаў артыкул „Подых Грузіі", прысвечаны 55-ай гадавіне ўстанаўлення савецкай улады ў Грузіі. Яшчэ ў ім гаварылася, што мала каму з польскіх грамадзян знаёма гэта далёкая краіна. Праўда гэта.

Напэўна сёння турысту з вакна легкавой машыны прыемна паглядзець на тыя дрымучыя лясы, што растуць на схілах Каўказкіх гор; на высокія сівыя скалы і вяршыні гор, пакрытыя вечнымі снягамі, што паднімаюцца вышэй воблакаў; паглядзець на горныя патокі, якія бяруць пачатак на вяршынях снежных гор і нясуць з грукатам вялікія кавалкі чорных скал; убачыць горныя каўказскія рэкі Рыон, Куру, Церак — там вада мутная і не такая спакойная, як у нашых рэках, яна шуміць, і бурліць, і зверху пакрыта белай пенай; цікава паглядзець і на велізарныя сады на схілах гор, абсаджаныя вечназялёным дрэвам кіпарысам, якое вакол сада стварае высокую і шчыльную сцяну, абараняючую ад вятроў сад, дзе растуць, спеюць яблыкі, вішні, слівы, персікі, абрыкосы, інжыр, вінаград і многія фрукты, назву якіх я нават не ведаю; а сустракаюцца ж і вялікія табачныя плантацыі, дзе вырошчваюцца лепшыя сарты табака, і чайныя плантацыі, асабліва ў заходняй частцы Грузіі, на ўзбярэжжы Чорнага мора.

Я па Грузіі як турыст не ездзіў, а прайшоў па ўсёй краіне са зброяй у руках. Пачынаючы ад горада Адлера, ішлі мы ў 1921 г. на вызваленне Грузіі ад англа-французскіх акупантаў.

Не памятаю добра, на другі ці на трэці дзень, але лінія абароны была намі прарвана. Захапілі мы шмат палонных і боепрыпасаў. Занялі населены пункт на тэрыторыі Грузіі, які называўся тады Пілінка. Далей вайна нам слала шлях уздоўж узбярэжжа Чорнага мора праз Гагры, Гудаут, Новы Афон (там наша брыгада панесла вялікія страты), Сухумі, Зугдзідзі, Ачэмчыры, Поці, Батумі і так дайшлі да ракі Чорах. Далей пачыналася Турцыя.

У тых месцах, дзе мы праходзілі, на самым беразе Чорнага мора, была пралажана шаша з Наварасійска ў Батумі, але гэта дарога дзень і ноч была пад абстрэлам з мора, асвятлялася пражэктарамі, і, калі быў заўважаны найменшы рух ці хоць адна фурманка, французы снарадаў не шкадавалі.

Таму трэба было ісці па непраходных лясах, высокіх гарах і снежных перавалах. Я быў сувязістам. Даводзілася несці на плячах усю тэлефонную маёмасць: вярстовыя катушкі тэлефоннага кабеля ці тэлефонны апарат, а яшчэ ж і руская трохлінейная вінтоўка са штыком, патроны, лапатка, рэчмяшок, кацялок...

У той час ішлі праліўныя дажджы. А там жа дождж не ідзе, як у нас — кроплямі, а лье, як з вядра. Увесь час мокрыя, прадзіраліся мы праз непраходныя лясы, нейкія калючыя кустарнікі накшталт нашай лазы (мы іх называлі „держы-дерево"), пераходзячы праз патокі па пояс у халоднай вадзе, мы ўпіраліся ў дно штыкамі, каб не сарвала нас бурнае цячэнне ракі, ішлі па пакрытых снегам чорных перавалах і глыбокіх цяснінах, у якія ніколі не прасвечвалася сонца. Спалі там, дзе застала ноч, на сырой зямлі. Не было гарачай стравы, бо палявыя кухні ад нас адсталі. Замест хлеба нам давалі стакан кукурузнай мукі ў суткі, і з гэтай мукі, змешанай з вадою, мы варылі ў часе начных прывалаў „мамалыгу". Разводзілі кастры, і кожны варыў сабе сам у сваім кацялку. Давалі нам муку раз у 3-4 дні, і некаторыя салдаты не вытрымлівалі і з'ядалі ўсё адразу. Каша без тлушчу часта прыгарала і ўся праходзіла дымам. Ад слабага харчавання мы пачалі хварэць на курыную слепату (пасля захаду сонца ўжо нічога не бачылі), цынгу, дэзінтэрыю і на каўказскую хваробу малярыю.

К канцу пахода мы былі ўжо так змучаныя і абдзертыя, што не былі падобны на салдат, толькі чырвоныя зоркі ярка гарэлі на нашых пілотках.

Назад ехалі таварнымі вагонамі. Селі ў горадзе Кутаісі. Прыехалі ў Краснадар у канцы мая. Атрымалі новае абмундзіраванне і пайшлі зноў на белагвардзейцаў.

Вось такім было маё знаёмства з Грузіяй.

Ціхан Трахімюк
Кленікі



На крадзеным не разжывешся. Адзін сакольскі рабочы — будаўнік ездзіць на працу аўтобусам (маршрут: Саколка—Бабікі—Слойка). Нядаўна вёз ён пад палою бляшанку белай эмаліі. А тая ўзяла і адчынілася. Эмалія расплылася па адзенні, забрудзіўся аўтобус. Наш „будаўнік" пачаў яе выціраць. Упэцкаўся (ні анёл, ні чорт!). На другі дзень ехаў у іншай вопратцы. Тую, што забрудзіў, выкінуў.
Вось табе і разжыўся!

Ніяк

ВЕР-НЕ-ВЕР

Снілася маёй маме, што прыйшла да нас суседка і пачала рабіць у нашай хаце парадкі. Усё вычысціла, пазбірала смецце, замяла мятлой і вынесла. Вельмі непакоюся, што гэты сон можа абазначаць нешта дрэннае. Адкажы, Астроне! Ванда

Мне прысніўся вельмі страшны сон. Быццам мой брат-пакойнік (забіўся некалькі гадоў таму назад на матацыкле) працягнуў да мяне з магілы руку, клічучы мяне да сябе. Ад таго часу не магу знайсці сабе спакою, не сплю па начах. Блізкія мне людзі кажуць, што сон вельмі дрэнны, што чакае мяне таксама хуткая смерць, бо брат клікаў мяне ў магілу. А я ж яшчэ зусім маладая, хочацца жыць...

Надзя з Гайнаўшчыны

Дарагія чытачкі! Не трэба аж так хвалявацца. Я ж не раз ужо гаварыў, што сон, які страшна выглядае, не заўсёды прадвяшчае нядобрае. Але...

Ванда! Сцеражыцеся вашай суседкі. Любіць яна пагаварыць пра вас з іншымі і вынесці смецце з хаты. Такіх людзей трэба асцерагацца. Пастарайцеся быць з ёю ў больш афіцыйных адносінах, каб не прыходзіла да вас, не падглядала і не ўмешвалася ў вашы справы. На свеце ж ёсць столькі мілых людзей!

Надзя з Гайнаўшчыны! Не паміраць вам яшчэ. Рана, і без патрэбы. Вы бачылі брата-пакойніка, і абазначае гэта, што будзеце жыць доўга і ў добрым здароўі. Іншая справа, што чакае вас нейкае цяжкае абвінавачанне (можа ў сувязі з вашым здароўем і радасцю жыцця, бо брат вас клікаў у магілу), але выйдзеце, як кажуць, „на суха" з гэтага. Магіла — цяжкае абвінавачанне, але з добрым заканчэннем справы для вас.

Астрон



ФОТА ПА ЗАКАЗУ

ABBA

Заказвалі К. Сакалоўская з Піражкоў і Я. Врублеўскі з Бельска.

Сардэчныя тайны

Дарагое Сэрцайка, разбярыся толкам у маёй справе, ды скажы, хто тут вінаваты і хто каго мае перапрасіць. Было гэта так. Мой зяць хадзіў на кастылях, а трэба было яму ісці ў другую вёску. Далёка гэта, і я падумала, што трэба яму памагчы. Я і кажу, „Не ідзі, не муч сябе. Бацька запражэ каня і паедзеш фурай". А ён мне тады са злосцю: „Не ўмешвайся ў мае справы! Усё мусіш ведаць!" Мне было вельмі крыўдна, што ж я яму такога дрэннага сказала? І я яму адказала: „Відаць, ты не хочаш, каб я да цябе гаварыла, дык не буду накідацца, калі я да цябе з добрым словам, а ты да мяне са злосцю". І ад той пары стала я да яго гаварыць, як кажуць, толькі „службова". А я ж яму выгадавала жонку, і такая мне цяпер за гэта заплата. Ён увогуле са мной не гаворыць, як бы я яму ворагам была. А як ты, Сэрцайка, думаеш?

Зінаіда з Гайнаўшчыны

Хто з вас вінаваты, мне цяжка сказаць. Бо як кажуць, хто гаворыць, таго і праўда. Але паколькі пачуць зяця я не магу, дык разглядаю справу так, як вы напісалі. Зяця няма за што перапрашаць, бо не зрабілі вы яму нічога дрэннага, наадварот, хацелі яму памагчы. У звычайных абставінах гэта ён павінен вас перапрасіць, бо аднёсся да вас вульгарна. Але тут справа іншая. Ваш зяць калека. Не ведаю, ці калецтва гэта трывалае, ці мо якраз хварэў. А маладыя людзі вельмі ўражлівыя на пункце свайго калецтва і не любяць, калі ім напамінаюць аб гэтым. Яго гэта нервуе, і ў выніку гэтага ён можа паводзіць сябе вульгарна. Калі б пайшоў сам, хаця яму было б цяжэй, але ішоў бы без дапамогі другіх. А седзячы на возе, ён бы адчуваў лягчэй фізічна, але псіхічна яму было б вельмі цяжка. І таму не гневайцеся на яго. І найлепш будзе, калі вы пачнеце гаварыць да яго „не службова", але нармальна, як бы нічога не сталася.

Сэрцайка

Куток практычных ведаў



ПЕРАСАДЖВАЕМ КАКТУСЫ

Ніколі, бадай, раней не былі ў нас так модныя кактусы, як у апошнім дзесяцігоддзі. Сапраўды, старанна дагледжаныя, яны аздобяць кожную кватэру, не гаворачы ўжо аб той, што абсталявана вельмі па-сучаснаму.

Ёсць людзі, якія проста любяць мець сярод іншых вазонаў і кактусы. А ёсць жа і вельмі зацятыя калекцыянеры. Яны то ўжо напэўна ведаюць, як кактусы даглядаць, каб добра раслі і размнажаліся.

Аднак многія „звычайныя" гадоўцы кактусаў часта мяркуюць, што кактусы не патрабуюць асаблівай апекі, мала вымагаюць, і няма патрэбы імі занадта займацца, паколькі могуць яны добра развівацца самі. Такое меркаванне няправільнае, бо і кактусы патрабуюць таксама спецыяльнага догляду.

Галоўнай справай у гэтым з'яўляецца перыядычная перасадка.


Якраз у канцы красавіка — пачатку мая і трэба гэтым заняцца. Выключэннем з'яўляюцца кактусы, якія ў гэты перыяд цвітуць ці маюць пупышкі. Іх нельга перасаджваць, трэба пачакаць, пакуль не адцвітуць.

Маладыя кактусы трэба перасаджваць штогод, старэйшыя — раз у дватры гады. Трэба выняць расліну з карэннямі з вазона (варта пры гэтым надзець тоўстыя рукавіцы, каб не пакалоць рукі). Калі б расліна не выходзіла з вазона лёгка, трэба знізу выпіхнуць карэнную брылу палачкай.

Маладым перасаджаным кактусам даем зямлю лягчэйшую, больш пясчаную, чым старэйшым. Толькі што перасаджаныя кактусы нельга ўгнойваць. Паліваем толькі тады, калі зямля пачне падсыхаць. Пакуль яны не закараняцца моцна, паліваць наогул трэба мала.

Калі летам пасля перасадкі на цвёрдых і калючых кактусах. паявяцца кветкі (цвітуць толькі некаторыя гатункі), будзе гэта знак, што перасадка пайшла кактусам на здароўе.

Гаспадыня



Кансультацыя юрыста

ПЫТАННЕ: Ці асобам, якія ў часе апошняй вайны знаходзіліся ў канцэнтрацыйным лагеры, а цяпер з'яўляюцца інвалідамі, належыцца пенсія або іншая кампенсацыя?

АДКАЗ: Згодна з законам ад 23 кастрычніка 1975 г. аб далейшай дапамозе ветэранам і вязням канцэнтрацыйных лагераў, прыслугоўваюць ім тыя самыя правы, што ваенным інвалідам, калі залічаны яны да адной з груп інвалідаў у выніку інвалідства, якое ўзнікла ў сувязі са знаходжаннем у лагеры, г. зн. калі прычынай інвалідства з'яўляецца скалечанне, кантузія або хвароба, якая ўзнікла ў сувязі са знаходжаннем у лагеры. Акалічнасць гэту сцвярджае лекарская камісія па справах інвалідства і працы.

У выключных выпадках вязням, інвалідства якіх паўстала не ў сувязі са знаходжаннем у канцэнтрацыйным лагеры, а, напрыклад, у выніку пазнейшай хваробы, або скалечання, можа быць прызнана інвалідская пенсія, калі залічаны да адной з груп інвалідаў. Мужчыны, якім споўнілася 60 год, і жанчыны, якім споўнілася 55 год, могуць у гэткім выпадку атрымаць пенсію па старасці. Зразумела, гэта адносіцца толькі да тых, каму не прыслугоўвае пенсія на іншых асновах. Не можа, напрыклад, атрымаць пенсію асоба, якая ўжо атрымоўвае пенсію па старасці ці інвалідскую пенсію, або мае сваю гаспадарку.

Такую пенсію для былых вязняў канцэнтрацыйных лагераў прызнае міністр па справах ветэранаў.



Раніцай 28 мая Арлоўскі і Драпеза з чатырнаццаццю партызанамі падышлі да моста ля станцыі Пціч. Заляглі ў кустах, пачалі назіраць за мостам, каравульным памяшканнем і рухам па чыгунцы. На вялікае здзіўленне партызан, мост ахоўваў толькі адзін вартавы. Змянілі яго праз дзве гадзіны, але ў каравульным памяшканні — Арлоўскі гэта ведаў дакладна — знаходзілася каля ўзвода добра ўзброеных салдат.

— Спакойна, надта спакойна нясуць службу салдаты, — прашаптаў Арлоўскі Драпезу. У голасе яго чуўся папрок.

— Але гэта нам на руку, — адказаў Драпеза.

— Так, не будзем іх ганіць, — пагадзіўся Арлоўскі, — але павучыцца ў праціўніка, як не трэба рабіць, варта. — Давай абмяркуем план аперацыі. Мая прапанова такая. Ты з дванаццаццю байцамі акружаеш будынак каравульнага памяшкання і закідваеш яго гранатамі, а я з Багдановічам і Канаваловым здыму вартавога, замініpую і падарву мост. Добра?

Драпеза кіўнуў. Праз некалькі мінут ён з групай байцоў ціха падбіраўся да каравульнага памяшкання. Вартавога здымаць не давялося: пачуўшы выбухі каля каравулкі, ён кінуў пост і што сілы пабег на станцыю. Арлоўскі спусціўся пад мост. Багдановіч дапамагаў несці тол, прымацаваць шнур да зарада. Канавалаў стаяў на беразе, трымаў канец шнура.

— Усё гатова, — сказаў Кірыла і, выбраўшыся на бераг, падпаліў бікфордаў шнур. Пераканаўшыся, што агеньчык пабег па ім, усе ўтрох кінуліся да групы Драпезы, якая працягвала бой з аховай моста. Праз некалькі мінут грымнуў выбух. Пераламаныя бэлькі моста, падляцеўшы ўгору, абломкамі ўпалі ў ваду.

„Такога адчування, як тады, у тыя хвіліны, у мяне ніколі не было, — пісаў пазней К. П. Арлоўскі. — Гэта — маё першае баявое хрышчэнне на чыгунцы. Ад напружання і спешкі, калі закладвалі зарады, градам ліўся пот, часта білася сэрца, хацелася піць, але гук выбуху супакоіў мяне. Прыемна было ўсведамляць, што некаторая частка работы, на якую мяне паслала партыя, зроблена".

Калі Арлоўскі, Канавалаў і Багдановіч прыбеглі да групы Драпезы, аперацыя, па сутнасці, была завершана: пачуўшы моцны выбух, каравульны гарнізон перастаў супраціўляцца і склаў зброю.

— Што будзем рабіць з палоннымі? — спытаў у Арлоўскага Драпеза. Польскія салдаты і афіцэры ўважліва сачылі за кожным яго рухам.

— Давай адыдзем, параімся, — прапанаваў Арлоўскі.

Адышоўшы метраў на дваццаць пяць, Арлоўскі сказаў:

— Ты пытаешся, што рабіць з палоннымі? Мне здаецца, тут асаблівай праблемы няма. Трэба прымусіць іх працаваць на нас.

— Як?

— Вельмі проста. Хай уносяць паніку ў рады праціўніка.

— Не разумею...

— Нічога, хутка зразумееш, — адказаў Арлоўскі і коратка расказаў яму пра сваю задуму.

Партызаны чакалі ўказанняў камандзіра, а палонныя — вырашэння свайго лёсу. У вачах іх былі і страх, і адчай, і просьба.

— Коні ёсць? — спытаў Арлоўскі ў афіцэра.

— Ёсць. Два! — шчоўкнуў абцасамі той.

— Драпеза і Каваленка, сядлайце коней! Багдановіч і Канавалаў, дастаньце затворы з трафейных карабінаў і кулямётаў і ўтапіце зброю ў рэчцы! — загадаў Арлоўскі. Затым адышоў убок, дастаў з сумкі блакнот і пачаў штосьці хутка пісаць. Вырваў з блакнота ліст, падазваў да сябе Драпезу, які ўжо гарцаваў на кані, і так, каб чулі палонныя, загадаў:

— Перадай данясенне камандзіру палка. А ты, — звярнуўся ён да Каваленкі, — скачы ў батальён і далажы камандзіру, што першае заданне выканана. Аперацыю працягваем, — і, паказаўшы пальцам, каб той нахіліўся, ціха, але так, каб чулі палякі, сказаў: — Капакевічы, Капцэвічы!

— Слухаю! — адрапартаваў Каваленка і паскакаў.

— А як жа з вамі быць, паны? — спытаў Арлоўскі.

— Мы не супраціўляліся, адразу склалі зброю, — адказаў адзін з салдатаў.

— Не па сваёй волі мы тут. Нас, сялян, мабілізавалі, — сказаў другі.

— Довады пераканаўчыя. Мы, партызаны, нявінную кроў не праліваем. Жывіце, але памятайце: хто з мячом на нас пойдзе, той ад мяча і загіне.

Хітрасць удалася. Палонныя прынялі „распараджэнні і ўказанні" Арлоўскага за сапраўдныя. І колькі іх не дапытвалі потым у польскай контрразведцы, яны ў адзін голас паўтаралі аб партызанскіх батальёне і палку. „Праўдзівасць" паказанняў сваіх падначаленых пацвярджаў і афіцэр. Яму гэта было выгадна: хто ж папракне афіцэра за тое, што яго ўзвод не змог утрымаць

ТРЫБУНА чытачоў

Крамы ў вёсцы Чыжы

У Чыжах дзве спажывецкія крамы, у якіх купляюць сяляне сваёй і суседніх вёсак. Найбольш людзей заходзіць у спажывецкі кіёск, асабліва ў дні скупкі, гэта значыць у панядзелкі і пятніцы. У тыя дні з'язджаецца ў Чыжы вельмі многа людзей па розных справах. А ў кіёску можна купіць дзе-што з'есці, ды і піўцо выпіць.

Трэба таксама сказаць, што і ў другой вялікай краме нямала людзей. Прадаўшчыцай тут А. Мазаноўская — вельмі добры працаўнік. Яна стараецца, каб людзі былі задаволены яе працай, заўсёды ветлівая, прыхільная.

В. Л.

Купаюцца ў балоце

Улады горада Бельска зрабілі месца на стаянку таксі каля чыгуначнага вакзала. Усё для пасажыраў! Але вось што: плошча, на якой знаходзіцца стаянка — гэта „балотнае возера“. Не хлушу — глыбіня гэтага „возера“ каля 40-50 см. Людзі не могуць дайсці да машын, шафёры запэцканы граззю, машыны забалочаны, таму што няма іх дзе і памыць.

Неабходна як мага хутчэй зрабіць стаянку як належыцца — выжвіраваць і палажыць бетонныя пліты. Няўжо далей будуць купацца бельскія таксі і пасажыры ў балоце?!

Іван Кірызюк

Паскудны ўчынак

У Орлі ў адной з крамаў, дзе прадаюць хлеб, гарэлку і мясныя вырабы, стаяць дзве прадаўшчыцы. Ды яны стаяць на змену — некалькі гадзін адна, некалькі — другая. І вось аднойчы заходжу я ў гэтую краму купіць паўкілаграма каўбасы. У гэты час стаяла там прадаўшчыца Жэня Сахарэвіч. Я яе прашу, каб адважыла мне паўкілаграма каўбасы. Ды яна не звяртае ўвагі на маю просьбу, а каля прылаўка ў гэты час нікога ў гэтым месцы не было. Толькі адна жанчына папрасіла хлеба, прадаўшчыца ёй дала, а я, стоячы тут жа, прашу зноў, каб прадала мне каўбасу. Ды яна ізноў „не чуе“. У другім месцы сталі людзі за рыбай, дык яна пайшла туды, адважыла ім рыбу. Але прыходзяць і іншыя людзі за каўбасой і яна ім важыць, а я прашу ўсё, а яна ўсё не звяртае на маю просьбу ніякай увагі. І так я прасіў яе цэлых паўгадзіны — разоў сем, ды яна мне так і не прадала гэтай каўбасы і я з нічым пайшоў сабе.

А мне ж 78 год, прайшоў чатыры гады грамадзянскай вайны, не маю здароўя.

Ці такія прадаўшчыцы павінны быць прадаўшчыцамі? То ж пішаце і вы часта, што прадаўшчыца павінна быць уважлівай да людзей, ветлівай, мець сумленне і добра ведаць свае абавязкі.

З паважаннем
Аляксандр Кубаеўскі
Орля

Веснавы пасеў угнаенняў

Ранняй вясной не так многа работы, і гэта яшчэ адзін плюс на тое, каб у гэты час высяваць мінеральныя ўгнаенні. Вось і ў Галадах некаторыя так зрабілі. Люба было глядзець, як некалькі трактараў СКР-у з раскідальнікамі за кароткі час высеялі мінеральныя ўгнаенні на палях. Яшчэ лепш робіць гэта ПГР-ы. Тут высяваюцца ўгнаенні самалётам. Гэтак робіцца ў бельскім ПГР-ы. У мінулым годзе на гэтым жа полі ад Бельска да Галадоў той самы самалёт рассяваў мінеральныя ўгнаенні. Вырасла кукуруза, як лес! Частка яе, аднак, змарнавалася ўвосень, бо не паспелі скасіць, але гэта ўжо іншая справа. Спадзяемся, што гэта не паўторыцца сёлета.

Валянцін Анапюк

У Сацах няма парадку

У вёсцы Сацы, Нараўскай гміны, быў дом дзяржаўнага фонду. Жыхары вёскі называлі яго святліцай. Там таксама ляжалі супрацьпажарныя прылады, а зверху была пажарная сірэна.

Частку таго дома займала жанчына са сваім сынам, бо і дом гэты быў часткова яе ўласнасцю. Сын падрос, і жанчына звярнулася да дзяржаўных улад з просьбай, каб дазволілі купіць ёй увесь дом. Дзяржаўныя ўлады, бачачы беднае жыццё жанчыны, зліталаваліся і прадалі дом.

Супрацьпажарная каманда з Сацоў забрала свае прылады і перанесла ў другі будынак. Таксама былі вымушаны зняць з даху сірэну. Год таму назад знялі сірэну і перанеслі да сваіх прыладаў. Там сірэна пачала адпачываць, лежачы ў кутку, бо не было каму яе ўмантаваць.

Восенню мінулага года, калі ўзнік пажар у Сацах, пажарнікі вынеслі сірэну і абы-як падключылі да хаты Паўла Петручука, так і стаіць яна там па сённяшні дзень. Няма каму яе падключыць да будынка, дзе ляжаць пажарныя прылады. Хто, праязджаючы праз вёску Сацы, не ведае гэтай сітуацыі, дык каля хаты Паўла Петручука знімае шапку і хрысціцца, бо думае, што гэта царкоўная харугва.

Хто гэтым усім павінен заняцца, не ведаю, ці раённая пажарная каманда ў Гайнаўцы, ці праўленне гміны ў Нараўцы?

М. Лук'янюк

Прапаў малочны бар

У Саколцы доўгі час не было малочнага бару. Людзі дапаміналіся, нават і „Ніва“ пісала аб гэтым. І адкрылі такі бар у Саколцы. Як добра было людзям зайсці сюды паснедаць ці паабедаць. А вось ад восені гэты малочны бар зноў ліквідавалі, а на тым месцы зрабілі краму тавараў, якія прадаюцца толькі за долары і за боны. Цяпер, калі захочаш паснедаць ці паабедаць, то трэба ісці ў рэстаран. Але на гэта не ўсім дазваляе кішэнь. Малочны бар у Саколцы вельмі патрэбны!

Віт

Ці кузаўцы не заслужылі?..

Аб кузаўскай вуліцы я пісаў на старонках „Нівы“ паўтара года таму назад. Зараз вяртаюся ад тых спраў таму, што за гэты час нічога не змянілася, хоць начальнік Чаромхаўскай гміны абяцаў вырашыць праблему ў 1975 годзе. Год мінуў, а кузаўцы далей жывуць абяцанкамі, што гмінная ўправа злітуецца і нешта ім паможа.

А вуліца псуецца ўсё больш. Цяпер, пасля дажджу немагчыма ёю прайсці. Ёсць і адрэзкі, што ў чорнай мазі можна боты згубіць. Няўжо кузаўцы не заслужылі, каб мясцовыя ўлады памаглі адрамантаваць ім дарогу ў вёсцы?

Хачу дадаць, што гмінная ўправа ў Чаромсе прызначае фонд іншым вёскам на будову і рамонт даяздных дарог, а Кузава з дзяржаўнага бюджэту не атрымала ані залатоўкі для той мэты. Крыўдзяцца людзі, што аб іх забываюцца. Магчыма, і зараз вярнулася б да кузаўцаў ідэя грамадскага чыну, як гэта калісьці бывала. Аднак пры такіх умовах і адносінах паміж насельніцтвам вёскі і гміннымі ўладамі цяжка гаварыць аб карысным вырашэнні справы. Мо, аднак, начальнік гміны ў Чаромсе знойдзе супольную мову з кузаўцамі і справа вырашыцца к супольнаму задавальненню?

(ус)

Бар у Шудзялаве

Уваходзячы ў шудзялаўскі бар, адразу не цяжка заўважыць, што тут парадак. А, ведама кожнаму, як нялёгка ўтрымаць яго ў такім месцы. Бо з людзьмі, як з людзьмі, калі каму трошкі ў галаве зашуміць, дык ужо і бяда. І асабліва за гэты парадак у бары пахваліць трэба буфетчыцу Зофію Рэдух, якая вельмі добра і заўсёды з усмешкай на твары выконвае сваю працу. Яшчэ сказаць хочацца, што цёплыя стравы асабліва тут смачныя і заўсёды гатовы на час. Добрыя людзі хваляць абслугу, парадак у шудзялаўскім бары не падабаецца толькі тым, каму хацелася б больш выпіць.

Я. Бандарук

Адказ на заклік ФАН

ГС у Нараўцы прыняў заданні на 50 тысяч злотых. Найбольш цікавымі чынамі з'яўляюцца: устанаўленне столікаў пры кіёску з марожаным, пасадка ружаў навокал вытворчага пункту газіраванай вады, правядзенне парадку на двух базах спулдзельні, пабудова фундаменту пад кіёск.

А гмінная школа ў Нараўцы са свайго боку рашыла выканаць наступныя чыны ў час вясны: навесці парадак на мясцовым стадыёне, пасадзіць дрэўцы пры дарозе даўжынёй 5 км, зрабіць некалькі школьных дапаможнікаў. Кошт чынавых прац школы складзе 25 тыс. зл.

Усе чыны будуць адбывацца пры ўдзеле ўсіх працаўнікоў ГС і вучняў школы. Большасць прац выканаецца да 1 мая.

Аляксандр Закройшчык

У школьнай бібліятэцы

Школьная бібліятэка ў групе сельскагаспадарчых школ у Бельску налічвае каля 11 тысяч тамоў. З гэтых кніжак карыстаецца моладзь і працаўнікі школы. Кожны дзень пазычаюць у сярэднім 48 кніжак. Сярод вучняў найбольш чытачоў у трэцім класе Сельскагаспадарчага тэхнікума.

У бібліятэцы знаходзіцца спецыяльная дошка, на якой адзначаюцца навакупленыя кніжкі. Часта бываюць тэматычныя выстаўкі, асабліва ў час майскіх „Дзён асветы, кніжкі і друку“.

Апрача кніжак, у бібліятэцы ёсць педагагічныя часопісы, з якіх карыстаюць ў асноўным настаўнікі. Бібліятэкарам з'яўляецца І. Зінкевіч, а яму ахвотна памагаюць вучаніцы з розных класаў.

Мікалай Няплоха

Перамаглі настаўнікі

У другой палове сакавіка ў спартыўнай зале агульнаадукацыйнага ліцэя ў Бельску сустрэліся зборныя валейбольныя мужчынскія каманды настаўнікаў бельскіх школ і бельскай міліцыі. Перамаглі настаўнікі з лікам 3:0.

Мікалай Няплоха



Анна Тышко, Савіны Груд (гміна Гайнаўка). Вашу справу мы накіравалі да юрыста і ад яго вы атрымаеце адказ.

Мікалай Кузьміцкі, калонія Геранімова (гміна Міхалова). Вы перадаеце сваю гаспадарку дзяржаве за пенсію і маеце намер пераехаць у Міхалова. Навошта вам тады электрычнае святло на калоніі Геранімова?

Вінцук Сарочынскі, Дзернякова (гміна Гарадок). Кіраўніцтва тэхнічна-гандлёвага сервіса „Агрома“ ў Беластоку адказала нам, што яна выслала грошы на ўсе рахункі, якія былі да яе накіраваны загадчыкам сельскагаспадарчай службай у Гарадку. Заплаціла нават у гэтым канкрэтным выпадку за закупленую на сіласы фальгу.

Таму вы звярніцеся ў гэтай справе ў гарадоцкую гмінную ўправу. Калі што не так, напішыце да нас.

Софія Д. (гміна Гайнаўка). Інвалідскую пенсію можаце замяніць на звычайную толькі тады, калі вы ўжо ва ўзросце пенсіянера і маеце такую колькасць гадоў працы, якая неабходная для атрымання пенсіі (art. 29 ustawy z dnia 23 stycznia 1968 r. o powszechnym zaopatrzeniu emerytalnym pracowników i ich rodzin — Dz.U. z 1968 r. nr 3, poz. 6 z późniejszymi zmianami).

(ця)

Вятрак Рыгора

У Крывяцічах былі калісьці тры прыгожыя млыны-ветракі: Івана Сачко, Антаніны Рагозы і Рыгора Ролі. Млыны стаялі і нішчэлі. З трох застаўся толькі вятрак Рыгора Ролі. Ён стаіць нявыкарыстаны, і толькі сам Рыгор час ад часу яшчэ і цяпер меле сабе збожжа ў сваім млыне-ветраку. А мо б так зацікавіўся крывяціцкім ветраком ахоўнік помнікаў культуры?

Іван Кірызюк

Хто меў рацыю?

У Гайнаўцы ў гэтым годзе пабудавалі і аддалі ў карыстанне вялікую краму „Дэлікатэсы“.

Тут амаль усё можна купіць і так, здаецца, усё было б вельмі добра, каб толькі крыху больш прыемнымі былі прадаўшчыцы. Яны амаль усе ўжо многа часу працуюць, а не ведаюць, як трэба адносіцца да людзей, не ведаюць, што ветлівасць належыць да іх абавязкаў.

Вось мне 20.III.76 г. здарылася тут адна непрыемнасць. Заходжу я ў „Дэлікатэсы“ і прашу 10 пачак экспартнага чаю. Прадаўшчыца палічыла і падсунула мне гэты чай. А ў мяне не было ў што гэты чай узяць, апрача кішэні ў паліто. Прашу, каб яна загарнула мне чай у паперу. Яна тады: „Гэта не мой абавязак“. А я яе яшчэ раз прашу. Яна пакрунула носам і пайшла далей, а мой чай як ляжаў, так і ляжыць. Гляджу, а мая сяброўка яшчэ з пачатковай школы таксама прадае. Давай я яе прасіць, каб яна мне запакавала гэты чай, але яна мне на гэта, што калі яе сяброўка мне не зрабіла, дык і яна не зробіць (вось дык сяброўка!). Людзей у краме было многа, яны на ўсё гэта здзівіліся таксама, і так я, нарэшце, яшчэ пасля іхняга голасу абурэння, узяла свой тавар, кінуты мне проста, як сабацы.

Дарагая „Ніва“, прашу цябе, адкажы, хто меў рацыю — я, ці прадаўшчыца? Мне здаецца, што несці такі чай не ўпакаваны — гэта так, як бы ўзяць кусок мяса і палажыць у кішэню.

Кліентка гайнаўскай крамы

Ад рэд. Рацыя была твая, але што на такія парадкі кіраўніцтва „Дэлікатэсаў“? Адказу пачакаем.

У АДКАЗ НА НАШУ КРЫТЫКУ

ПРА ДУБЯЖЫНСКУЮ СВЯТЛІЦУ

Даўно ўжо была пабудавана дубяжынская святліца, у асноўным грамадскім чынам жыхароў вёскі. Адкрыта была ўрачыста. Але, як гэта часта бывае, любяць у нас нечага не даканчыць. І так было з дубяжынскай святліцай. Наш карэспандэнт у 3 нумары „Нівы“ з 18.III. крытыкуе, што ў дубяжынскай святліцы не памалявалі вонкавых сцен. А вось адказ у гэтай справе начальніка Бельскай гміны.

W związku z ukazaniem się artykułu w tygodniku „Niwa” przesłanego w dniu 5.02.76 r. w sprawie nie pomalowanej świetlicy we wsi Dubiażyn, uprzejmie wyjaśniam:

Przedmiotowa świetlica wykonywana była przez Rzemieślniczą Spółdzielnię w Siemiatyczach. Sp-nia, jak również i rzemieślnik, który wykonywał roboty, akazali się niesolidnymi wykonawcami, dowodem czego było ciągłe przedłużanie terminu zakończenia budowy. Po licznych interwencjach postanowiono oddać budynek bez pomalowania ścian zewnętrznych.

W tym czasie mieszkańcy wsi: Pilipki, Parcewo, Proniewicze, Nałogi, Pasynki i Widowo, chcąc podnieść kulturę w swoich miejscowościach, złożyli wnioski o przydzielenie budynków z rozbiórki, z przeznaczeniem na świetlice wiejskie. Pomimo wielkich przeszkód i trudności budynki otrzymały wsie: Proniewicze, Pilipki, Nałogi i Parcewo. W związku z tym, że otrzymane budynki pochodziły z rozbiórki, a jednocześnie był podany termin rozbiórki należało szybko rozebrać i przewieźć wspomniane budynki na przeznaczone miejsce. Po przywiezieniu, chcąc uniknąć niszczenia materiałów, należało jak najszybciej rozebrane budynki postawić w stanie surowym. Przedsięwzięcie to pociągnęło za sobą nieprzewidziane koszta.

Remont świetlicy we wsi Dubiażyn został zaplanowany na bieżącą pięciolatkę.

Naczelnik gminy
mgr inż. Jerzy Kalina

мост і здаўся партызанам, калі супроць узвода дзейнічаў цэлы полк.

На прывале Ануфрый Драпеза коратка падвёў вынікі аперацыі, потым уважлівым позіркам абвёў сваіх байцоў:

— Таварышы! Ваня (на той час у Арлоўскага была клічка — Ваня) — вопытны падрыўнік, храбры партызан, добры арганізатар. Вось чаму я здымаю з сябе абавязкі камандзіра атрада і прапаную камандзірам абраць таварыша Ваню.

Партызаны добра ведалі і любілі свайго земляка Драпезу. Доўгі час партызанілі пад яго камандай, прывыклі да яго. Не адзін раз хадзілі ў засады, нападалі на ворага і заўсёды, дзякуючы яго разважлівасці і вопыту, выходзілі пераможцамі. За адвагу і смеласць падабаўся ім і Ваня. Што ж тут рабіць?

— Дазвольце, таварыш камандзір, — устаючы, сказаў Арлоўскі.

— Табе дамо слова пазней, — спыніў яго Драпеза. — Мне спачатку з хлопцамі трэба пагаварыць. — Драпеза змоўк, маўчалі і байцы. — Таварышы, я не збіраюся разводзіць дэбаты. Скажу коратка: таварыш Ваня ў грамаце мацнейшы за мяне і вопыт большы мае. Яму і камандзірам быць. Згодны?

— Згодны! — дружна адказалі байцы.

Так Арлоўскі ўзначаліў атрад. Па яго прапанове намеснікам камандзіра атрада быў абраны Ануфрый Драпеза.

(Працяг будзе)


„Niwa” — Tygodnik RSW „Prasa—Książka—Ruch”. Skr. poczt. 149. 15-950 Białystok. TELEFON 2-32-41. Wydawca Przedsiębiorstwo Wydawniczo-Kolportażowe RSW w Białymstoku. PRENUMERATA: Oddziały „Ruchu”, urzędy pocztowe i listonosze. Indeks 36911/36671.

Ці лёгка рассмяшыць жанчыну?


— У вас ёсць пачуццё гумару? — спытала яна мяне.
— Вядома!
— Тады раскажыце мне што-небудзь смешнае.
— Смешнае? Колькі хочаце! Ведаеце, у нас на рабоце не занудзішся! Вось вам калі ласка! Куркоў прыйшоў учора ў аддзел у піжаме і шлёпанцах.
— Ой! Бедны! Мне яго шкада, які смех! Дык усе навокал пачалі смяяцца над ім, так?
— Не. Ніхто не прыкмеціў. Адзін я смяяўся. Тааак... Што ж вам яшчэ расказаць? Ага, вось смешная гісторыя: наш нам Шапаў заглядзеўся на дзяўчыну па дарозе на службу і трапіў пад ровар...
— Ды што вы?! Пакалечыў што-небудзь?
— Ровар... Мммм. Як жа вас рассмяшыць усё-такі? Вось. Не далей як учора наш Петухоў палез у сейф з цікавасці і выпадкова там зачыніўся разам з ключамі.
— Вы гэта сур'ёзна? Які кашмар! І што ж? Доўга ён там, няшчасны, сядзеў?
— Не. Не вельмі. Аўтагенам выразалі. Крыху пасівеў. На скронях... Ну што вам расказаць па-сапраўднаму смешнае? Наш планавік Галошын пакаўзнуўся ў сталовай на маннай кашы і плюхнуўся проста ў акварыум з рыбамі ў нашай сталовай.
— Няўжо? Вы мяне проста засмуцілі! Як жа можна? Што ж гэта за парадак у вашай сталовай? Куды, цікава, глядзеў мясцком?
— Куды і ўсе. У акварыум. Ён там мінут пятнаццаць цыклопамі карміўся. Абедаў гэта значыць... Та-ак... Як жа ўсё-такі мне вас рассмяшыць? Наш Сушкін бутэльку пальцам адкрываў нядаўна, корак прапхнуць прапхнуў, а назад палец ніяк.
— Жудасць! Ён хоць скеміў хутчэй разбіць бутэльку?
— Скеміў: што калі яе разбіць, дык тое, што ў бутэльцы, выльецца.
— Так, небарака, і ходзіць?
— Так і бегае. Каб пахудзець разам з пальцам, каб яго потым выцягнуць... Т-ак... Як жа ўсё-такі вас рассмяшыць? Няўжо не ўдасца? Ну вось: наша прыбіральшчыца Валя ўжо пахудзела. Прычым да такой ступені, што яе за кіем шчоткі не відаць.
— І вы глядзіце? Яна ж, відаць, апасна хворая!
— Не. Закахалася. А гэта не апасна.
— У каго ж яна ўлюпалася?
— У мяне.
— Што-што? Паўтарыце!
— У мяне.
— У вас? Ой, не магу!
— А што тут смешнага, не разумею?
Усё-такі я яе рассмяшыў. Хоць у апошнім выпадку ўпершыню сказаў праўду.


Андрэй Кучаеў
(СССР)

XX ВЕК



— Давай душу!





З ПАЛЯВАННЯ

Дацэнт Цімох Скок вяртаецца дамоў з палявання з багатай здабычай. Радасная жонка:
— Нарэшце і табе пашанцавала, а дзе сабака?
— У сумцы.



ДАСТОЙНЫ АДКАЗ

Жыў у вёсцы дужа скупы чалавек. Ён любіў пазычаць, але не любіў аддаваць.
Аднойчы ён прыйшоў да свайго суседа і папрасіў:
— Браточка, Антон, пазыч пару рублёў. Трэба ў магазін наведацца. Як намацаю ў кішэні твае грошы — адразу і цябе ўспомню.
А сусед яму ў адказ:
— А ты мяне і без пазыкі ўспомніш. Калі не намацаеш у кішэні пазычаных грошай, то і скажаш: „Ліха яму, гэтаму Антону, — не пазычыў".

НА ШЫРОКІМ СВЕЦЕ

У дзверы звоніць прадстаўнік фірмы, якая прадае мышалоўкі.
— У нас ужо ёсць мышалоўка, — кажа гаспадар.
— Наша — самае апошняе вынаходства, яна прадаецца проста з мышшу ўнутры...

* * *

У турэмную камеру (справа маецца ў Паўднёвай Амерыцы) упіхаюць трох чалавек. Арыштанты пачынаюць адзін з другім знаёміцца.
— Ты за што трапіў? — пытаюць у першага.
— За тое, што я супраць прэзідэнта.
— А ты? — пытаюць другога.
— За тое, што за прэзідэнта.
— А ты за што сюды трапіў? — звяртаюцца да трэцяга.
— За тое, што я прэзідэнт.

МІНІВЕРШЫ

РОСТ

Знайшоўшы нейк
важны пост,
Індык пайшоў
нястрымна ў рост.
І ў рост пайшлі
ўсе індыкі
з яго начальніцкай
рукі.

А. Часоўнікаў



Была б у мяне хоць адна добрая якасць, я схаваў бы за ёй усе свае недахопы.
Ён быў птушкай невысокага палёту, але вельмі індычыўся.

ПЕСНІ ПА ЗАЯЎКАХ

Па просьбе Валянціны Зубрыцкай, Яўгеніі Мароз, Алі Матысюк, Яўгеніі Сухадолы і Святланы Новік з Семяноўкі змяшчаем песню


NASZ ŚWIAT

tekst polski: A. Kudelski
muzyka: Anderson
śpiewa Grupa Sezam

O czymś miłym, łagodnym
marzy sobie każdy z nas
Żeby cudowny
Żeby był pogodny świat
Rozmowy ptaków, zapach traw
Spacery przez wiosenny las
Tymczasem życie nas
Wciąż gna, i gna, i gna, i gna...

Nasz świat
świat szalony
w huku miast zagubiony
Biegnie do nikąd
W obłąkanym krzyku
I z piskiem opon gna
Nasz świat
świat szalony
w huku miast zagubiony
Pośpiechem dnia zmęczony
Nasz świat
Nasz świat
Nasz świat

Nigdy nie za wiele
pełnych słońca niedziel mam
Pod błękitnym niebem
świerszcz nad strumieniem gra
Powietrze, słońce, ptaków śpiew
potrzebne ludziom są jak chleb
Tymczasem życie nas
Wciąż gna, i gna, i gna...
Nasz świat
świat szalony
itd.



ДОБРЫ КАСТУСЬ

Нейк за абедам Кастусіха кажа Кастусю:
— Кастусёк, які ты ў мяне добры! Я ўчора і сёння перасаліла боршч, а ты — ні слова...
— Ану паспрабуй перасаліць яшчэ і заўтра! — кінуў Кастусь.

ГАПКА Ў КІНО

— Прашу прабачэння, пані, здыміце, калі ласка, ваш капялюш! Я заплаціў дзесяць злотых за білет у кіно і хачу што-небудзь убачыць.
— А я за свой капялюш заплаціла трыста злотых і хачу, каб яго бачылі ўсе.

КЛОПАТЫ ХВЯДЗЮЛІ


— Ты чаму так часта п'еш валяр'янку?
— Жонка вельмі нервовая, трэба яе берагчы.

МІКОЛКА

Пачаўся ўрок. Настаўнік выклікае да дошкі Міколку.
— Яго няма, — адказалі вучні.
— А дзе ён?
— Ды ён зламаў сабе нагу, — кажа Міколкаў таварыш, — і таму пабег дамоў.

ЗНАЁМЫЯ

Дзве жанчыны размаўляюць аб сваёй сяброўцы:
— У яе столькі знаёмых, што многіх з іх яна нават ніколі не бачыла.



— *Вось увесь ваш бацька! Як толькі пачуе аб талерцы, заўсёды думае толькі аб адным!*

КУРЁЗЫ

КЛУБАМАНІЯ

Яшчэ нядаўна Англія трывала трымала першае месца па розных незвычайных клубах. Цяпер выклік „туманнаму Альбіёну" кідае Францыя. Тут з'явілася мноства клубаў. Сярод іх — „Клуб аўтамабілістаў, якім не падабаецца ездзіць у адзіноце", „Клуб абаронцаў правоў пешаходаў", „Клуб тых, хто важыць 100 кілаграмаў". Ёсць нават „Клуб сяброў аслоў".

ДРЫЖЫЦЕ, ЗЛОДЗЕІ!

Нечаканая бяда звалілася на злодзеяў у Швейцарыі. Не падумайце, што іх там пачалі старанна лавіць і выводзіць за вушка на сонейка. Не падумайце таксама, што для злодзеяў тут прыдумалі найбольш хітрае і жорсткае пакаранне. У швейцарскіх злодзеяў — другая бяда. Федэральны адміністрацыйны суд Швейцарыі прыняў пастанову, у якой гаворыцца: „Злодзей, які неадназразова прадаваў украдзеныя ім тавары, лічыцца ў сэнсе падаходнага падатку прадпрымальнікам і таму падлягае падаткаабкладанню".
Такім чынам, раскашэльвайцеся злодзеі, хопіць вам утойваць прыбыткі...

ТРУДНАВАТА

Адна наіўная паненка спытала польскага юмарыста Станіслава Ежы Леца:
— Вам, напэўна, трудна выдумляваць усё з галавы?
— Труднавата, — адказаў Лец. — Але выдумляваць з нагі было б яшчэ трудней.



Скромнасць упрыгожвае нават тых, каму яна не да твару.